Вершы складаць ☞ 3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

СВЯТА ГАРАДКА ☞ 8

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 37 (2522) Год XLIX | Беласток, 12 верасня 2004 г. | Цана 2,00 зл.

Калі ліквідуецца школа, вёска памірае, — гаворыць Анатоль Дунда. — Верым, што знойдуцца добрыя людзі, якія памогуць захаваць школу ў Арэшкаве на будучыню...

Будзе школа ў Арэшкаве

Адкрыццё навучальнага года ў Падставовай школе ў Арэшкаве было асаблівым. З вучнямі прыйшлі бацькі, якія, каб не закрылі школы, у час канікул на грамадскіх пачатках і за свае сродкі адрамантавалі школьны будынак і добраўпарадкавалі школьную пляцоўку. Зрабілі больш, чым абяцалі гмінным радным.

Вясной радныя Гайнаўскай гміны прагаласавалі за абмежаванне дзейнасці школы, з шасцікласнай на трохкласную. Супраць пастановы запратэставалі бацькі, жыхары Арэшкава і навакольных вёсак. Іх голас узяла пад развагу беластоцкі куратар Зофія Транцынгер-Кочук і не дала згоды на змены. Калі бацькі прасілі радных пакінуць шасцікласную школу, абяцалі многа зрабіць і стрымалі слова. Высеклі таполі, выкасілі траву і зрэзалі кусты на школьнай плошчы. Перабудавалі сходкі перад галоўным уваходам і аблажылі іх грэсам. Разбурылі знішчаны ўмяшчальнік на смецце і збудавалі новы з дубовымі дзвярыма. Адрамантавалі падлогу ў выбранай настаўнікамі школьнай зале, абудавалі на калідоры радыятары і замуравалі ўмяшчальнікі на вугаль. Дадаткова адрамантавалі арэлі і за свае грошы купілі гігіенічныя сродкі і крэйду.

На адкрыццё школьнага года, якое адбылося ў прыгожай гімнастычнай зале, дзеткі прыйшлі ў белых блузках і кашулях. Выдатнікі выйшлі са сцягам, а ў час мастацкіх выступленняў гучалі беларускія вершы і песні. У рэпертуары школьнага хору, які дабіваўся поспехаў на раённых і ваяводскіх конкурсах, выдатная большасць беларускіх песень. Дэкламатары перамагалі ў беларускамоўных конкурсах, а бацькі звыкліся, што ў час школьных мерапрыемстваў многа выступленняў па-беларуску. Дырэктар Гражына Беразняк падзякавала ўсім бацькам за работу і фінансавую падтрымку. З выпадку 65 гадавіны фашысцкай агрэсіі на Польшчу запрапанавала мінутай цішыні ўшанаваць памяць загінуўшых у час вайны. Сярод іх былі жыхары Арэшкава і наваколля і таму гэтая цішыня была асаблівай для сабраных.

Пасля супольнай сустрэчы вучні разышліся на спатканні з класнымі выхавацелямі. Сёлетнія выпускнікі, вучні шостага класа, сабраліся ў кабінеце беларускай мовы. Настаўніца роднай мовы Ірэна Герасімюк падрыхтавала беларускамоўныя насценгазеты, выстаўку даўніх народных вырабаў і колішніх прыладаў працы. Вучні ў час канікулаў памагалі бацькам парадкаваць тэрыторыю вакол школы. Яны згодны, што школьны будынак цяпер вельмі прыгожы.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Вучні VI класа спаткаліся з выхавацелем Ірэнай Герасімюк

— Падабаецца нам наша школа. У ёй прыгожыя гімнастычная зала, кабінеты інфарматыкі, беларускай мовы і іншыя залы, — пералічваюць Рафал Навіцкі, Юля Міхалоўская і Аня Малашэвіч. Вучняў цікавяць заняткі беларускай мовы з Ірэнай Герасімюк. Экскурсіі, расказы і спевы робяць урокі роднай мовы займальнымі.

— Хочам вучыцца блізка дому, у Арэшкаве, — дабаўляе Рафал Навіцкі.

Бацькі раней таксама ангажаваліся ў дапамогу школе. Рамантавалі падлогі і парадкавалі тэрыторыю вакол школы. Цяпер неабходны рамонт вонкавых сцен і агароджы.

— Трэба падзякаваць бацькам за працу на карысць школы. Дастаткова толькі сказаць, што трэба нешта зрабіць, то прыходзяць і памагаюць, — кажа дырэктар школы. — Мы за тое, каб наша школа засталася. У меншых школах лягчэй зацікавіць вучняў навукай і развіваць іх здольнасці. У нас хатняя атмасфера і амаль індывідуальнае навучанне. На ўроках бачым кожнае дзіцё. Можам падысці да слабейшых вучняў і растлумачыць ім тое, чаго не разумеюць. У спалучаных класах дзеці лепш інтэгруюцца.

Пасля ўрачыстасці бацькі збіраюцца перад школьным будынкам і разважаюць, што трэба зрабіць, каб захаваць школу на наступныя гады. Уладзімір Галёнка з Пасечнікаў-Вялікіх, які з'яўляецца гмінным радным, пералічвае, што зрабілі бацькі, каб асталася школа.

— Наша гміна бедная і мы ўсе гэта разумеем. Школа ў Арэшкаве можа зарабляць на сябе. Можна здаваць кватэры, якія знаходзяцца ў школьным будынку. У час канікулаў можна арганізаваць у школе турыстычную базу. Калі ліквідуецца школа, вёска памірае, — гаворыць Анатоль Дунда. — Верым, што знойдуцца добрыя людзі, якія памогуць захаваць школу ў Арэшкаве на будучыню.

— Нашы бацькі і дзяды памагалі будаваць школу і мы будзем намагацца, каб яна засталася, — заяўляе Аляксей Галёнка з Пасечнікаў-Вялікіх. З ім згодны Юрка Бугвін і Уладзімір Камароўскі, якія моцна ангажаваліся ў рамонтныя работы. Бацькі разыходзяцца з надзеяй, што радныя будуць мець на ўвазе голас жыхароў Арэшкава і наваколля і школа астанецца.

Аляксей Мароз

Мова і змова ☞ 2

Віктар Сазонаў

Так званая „зялёная карта" ў Польшчы каштуе амаль у два разы танней, чым у Беларусі. Ну які дурань будзе пераплачваць. Тым больш тыя гандляры, якія лічаць кожны рубель, і ў змозе выжыць толькі за кошт жорсткай ашчаднасці. Вось і паплылі долары ў казну суседняй дзяржавы...

Ідэалагізацыя ☞ 2

Юры Гумянюк

Публікацыя ў газеце „Вечерний Гродно" не спрыяе наладжванню нармальных узаемаадносінаў паміж палякамі, беларусамі і расіянамі. Бо замазванне гістарычнай праўды не залагоджвае канфлікты і спрэчкі, а наадварот — раздрапвае старыя незагоеныя раны...

Сейм аб Беларусі ☞ 2

Мацей Халадоўскі

Польскія палітыкі ўсё часцей і часцей пачынаюць гаварыць аб Беларусі. Хутчэй уцякаюць яны ад спробы адназначнага акрэслення, як павінны выглядаць адносіны еўрасаюзнай Польшчы да гэтай краіны, у адзін голас выказваючы перакананне, што без захавання там дэмакратычных працэдур няма гаворкі аб якім-небудзь набліжэнні...

Вяртанне мовы ☞ 5

Ганна Кандрацюк

Званю яшчэ ў Залукі. Год таму адрадзілася там беларуская мова. Палова навучэнцаў наведвала ўрокі, дзеткі выпісвалі „Ніву", прымалі ўдзел у беларускіх дэкламатарскім і тэатральным конкурсах. Словам, мелі кантакт з іншымі беларусамі.

— W tym roku już nie będzie języka białoruskiego...

Даследчык Драгічына ☞ 9

Віталь Луба

Трыццаць шэсць гадоў свайго жыцця (1864-1900) Мікалай Авенарыус звязаў з Драгічынам. У гэты час раскопваў ён курганы, наглядаў за стратыграфіяй культурнага слоя, фіксаваў адкрытыя археалагічныя помнікі, ствараў калекцыі старажытнасцей, цікавіўся нумізматыкай і сфрагістыкай, публікаваў артыкулы ў пецярбургскіх выданнях...

Беларускія спартсмены ☞ 10

Уладзімір Хільмановіч

15 сумарных медалёў (два залатыя, шэсць срэбных і сем бронзавых) прывялі нас да 18-га месца ў агульным медалёвым заліку і да 19-га па ачках. Пасля нас такія тэрытарыяльна вялікія краіны як Канада, Бразілія, Турцыя, Польшча, Швецыя і многія іншыя, больш развітыя дзяржавы...

9 770546 196000

Мова і змова

Першага верасня ў Беларусі пачаўся новы навучальны год. Для большасці гэта свята. А на мяжы Беларусі з Еўрасаюзам зноў было неспакойна. І не ад таго, што люты вораг перайшоў нашу мяжу. Проста беларускія памежныя службы перасталі прапускаць за мяжу беларусаў, якія купілі ў Польшчы страхавы поліс грамадзянскай адказнасці на сваю машыну. Калі ў двух словах, то сутнасць канфлікту такая. Так званая „зялёная карта" ў Польшчы каштуе амаль у два разы танней, чым у Беларусі. Ну які дурань будзе пераплачваць. Тым больш тыя гандляры, якія лічаць кожны рубель, і ў змозе выжыць толькі за кошт жорсткай ашчаднасці. Вось і паплылі долары ў казну суседняй дзяржавы. Зразумела, што такі стан рэчаў не задавальняў беларускі ўладны бок. Трэба было тэрмінова рабіць нейкія захады. Першая лагічная думка, што прыходзіла ў галаву, гэта наблізіць кошты да еўрапейскіх. І тады беларусу не было б розніцы, дзе набыць страхавы поліс. Купляў бы ў сябе. Навошта яму клопаты за мяжой. Але нашы кемлівыя фінансісты пайшлі іншым шляхам. Сваім. Праверaным гадамі. Проста забаранілі выпускаць з Беларусі тых, хто набыў „зялёную карту" не ў нас. Навошта ім так істотна змяншаць кошты.

Нашы пакрыўджаныя гандляры хуценька падлічылі, што шэсцьдзесят долараў — гэта больш чым трыццаць і давай пратэставаць. На пачатку нават нібыта перамаглі. Пасля таго, як перагарадзілі сваімі машынамі дарогу і не прапускалі нікога пераехаць запаветны шлагбаум, улады адтэрмінавалі дату новаўвядзення. Але, пачакаўшы трошкі, зрабілі па-свойму.

Гандляры хацелі паўтарыць сваю акцыю. Ды на гэты раз яна не мела поспеху. Іх было мала. Першага верасня большасць беларусаў, у тым ліку і тых, хто ездзіць за мяжу, павялі сваіх дзетак у рускамоўныя школкі. А тым, хто прыехаў на мяжу, заставалася толькі адзначыць, што ва ўладзе сядзяць не дурні і для рэалізацыі новага ўказа падабралі адпаведны дзень.

На пачатку, пад пільным наглядам міліцыі, самыя наіўныя яшчэ нешта даказвалі прадстаўнікам улады, паказвалі газеты з указам, спасылаліся на нейкія дакументы. Некаторыя чакалі падмогі калегаў, якія па іх словах вось-вось пад'едуць. Большасць проста стаялі разгубленыя. Былі і такія, хто шчыра верыў у гандлярскую салідарнасць і заклікаў перакрыць машынамі дарогу. Як мінулы раз. Ды так ужо не атрымалася. А найхітрэйшыя куплялі ў беларускіх агенцтвах страхавыя полісы, і са словамі „пакуль гэтыя мітынгуюць і на мяжы няма чэргаў, я змагу пераехаць тудысюды некалькі разоў і кампенсаваць кошт страхоўкі", шпарка несліся на сваіх машынах на захад па сваё гандлярскае шчасце.

Да мяне падышоў сталага веку, загарэлы, шыракаплечы мужчына. Закурыў. Ветліва прывітаўся.

— Ну што, — спытаў, — вы таксама ў Польшчу едзеце?

— Не, — адказаў я. — Проста паглядзець прыехаў. З журналісцкай цікавасці. Можа напішу што-небудзь пра гэта.

— А што тут глядзець, і што тут пісаць, — хмура і злосна сказаў ён. — Раней глядзець трэба было. Нам усім глядзець.

— Сапраўды, — асцярожна падводжу яго да тэмы, якая цікавіць мяне. — А чаго мы чакалі? Мы ж нават мову сваю не шануем. Хто будзе нас паважаць?

— Ага, — пагадзіўся мужчына. — А былі разумныя людзі, якія даўно яшчэ тлумачылі, што трэба змагацца за сваё. Калі, што заменай нашай мовы на чужую справа не скончыцца. А мы не верылі. Ад мовы, думалі, каўбасы не прыбавіцца. А зараз бачыш якую змову зрабілі. Дзень такі падабралі, калі дзяцей у школу трэба весці. Мая жонка таксама павяла ўнука ў першы клас. А я абяцаў яму пачастунак з Польшчы прывезці. Для мяне гэты пачастунак, калі давядзецца столькі заплаціць за пераезд, залатым будзе. Штосьці трэба рабіць. Неяк ратаваць сітуацыю. А то зусім на карак сядуць.

— Што праўда, то праўда, — падыграў я яму. — Толькі вось што рабіць? Вось вы самі толькі што гаварылі пра нейкіх там разумных людзей, што супраць змены мовы выступалі. Самі сцвярджалі, што яны мелі рацыю. Можа трэба пачаць ад пачатку. Не ехаць вам сёння ў Польшчу, а вярнуцца назад, пайсці ў школу, дзе будзе вучыцца ваш унук і напісаць заяву, каб вучылі яго на нашай мове. А там, глядзіш, і ўсё астатняе наладзіцца.

Мужчына адхіснуўся ад мяне як абвараны. Зрабіў крок назад. Прыжмурыў вочы, паглядзеў вельмі падазрона.

— А ты часам не з апазіцыі, — спытаўся ў мяне, нечакана перайшоўшы на „ты", і, не чакаючы адказу павярнуўся ды пасунуўся ў нейкае беларускае агенцтва купляць страхавы поліс для выезду за мяжу.

А я сеў у машыну і паехаў па сваіх справах. Не стаў чакаць чым скончыцца канфлікт ля мяжы. І так вядома, чым ён раней ці пазней скончыцца.

Віктар Сазонаў (Гродна)

Заідэалагізаваныя часы

Прадстаўнікі беларускай і польскай інтэлігенцыі нататку „Почтили память героя Польши", надрукаваную 1 верасня ў газеце „Вечерний Гродно", успрынялі як спланаваную палітычную правакацыю.

Асаблівае абурэнне выклікаюць два моманты публікацыі. Па-першае, у нататцы сцвярджаецца, што героя паўстання 1863 года Рамуальда Траўгута пакаралі смерцю 140 гадоў таму ПОЛЬСКІЯ (!) ўлады. Хаця тады Польшчы як самастойнай дзяржавы не існавала, а паўстанне 1863 года мела нацыянальна-вызвольны характар і было скіравана супраць царызму. А па-другое, паводле інфармацыі газеты „Вечерний Гродно", помнік герою, узнесены ў Свіслачы ў 1928 годзе, „в сентябре 1939 года во время ОСВОБОДИТЕЛЬНОГО (!) похода в Западную Белоруссию ПО НЕЗНАНИЮ (!) красноармейцы разрушили".

Рамуальд Траўгут, 1863 г.

Мне, як сябру Беларускага ПЭН-цэнтра, паэту і публіцысту, здаецца вельмі сімптаматычным, што публікацыя выйшла менавіта 1 верасня — якраз на 65-гадавіну нападу фашыстоўскай Нямеччыны на Польшчу. Ну а з тым „вызвольным паходам" чырвонаармейцаў у Заходнюю Беларусь ды іх „незнанием" выйшаў канкрэтны пракол. Гэта хлусня, што „вызваліцелі" знаходзіліся ў палоне нейкага „няведання". Яны якраз ведалі, што рабілі! Тады ў Заходняй Беларусі, паводле загаду Масквы, праводзілася планамернае вынішчэнне нацыянальна свядомай інтэлігенцыі ды найбольш здольнага працоўнага люду...

Публікацыя ў газеце „Вечерний Гродно" не спрыяе наладжванню нармальных узаемаадносінаў паміж палякамі, беларусамі і расіянамі. Бо замазванне гістарычнай праўды не залагоджвае канфлікты і спрэчкі, а наадварот — раздрапвае старыя незагоеныя раны. І, калі знешне бяскрыўдная нататка друкуецца ў масавай газеце, адным з заснавальнікаў якой з'яўляецца Гродзенскі гарадскі выканаўчы камітэт, дык цалкам верагодна, што публікацыя была санкцыянаваная зверху, а падобная „гістарычная праўда" выгадная цяперашнім беларускім уладам.

— Так, гэта вельмі падобнае на правакацыю, бо апошнім часам у афіцыйным дзяржаўным беларускім друку ўчасціліся падобныя інсінуацыі, — каментуе гісторык, старшыня абласнога аддзялення Фонду імя Льва Сапегі Уладзімір Хільмановіч. — І чаму гэта Рамуальда Траўгута падаюць выключна як героя Польшчы? Ён гэтаксама і герой Беларусі. А тое, што ён быў павешаны ў 1864 годзе ў Варшаве, зусім не азначае, што гэта зрабілі польскія ўлады! Якое глупства — Варшава ж тады знаходзілася пад расійскай царскай уладай! Дарэчы, штогод у кастрычніку па ініцыятыве гродзенскай нацыянальнасвядомай інтэлігенцыі ў Свіслачы ладзіцца ўшанаванне памяці паўстанцаў 1863 года, людзі ўскладаюць кветкі ля помніка Рамуальду Траўгуту і на магілу брата Кастуся Каліноўскага — Віктара...

Па ўсім відаць, публікацыя ў „Вечернем Гродно" выкліча незадаволенасць не толькі польскай грамадскасці ў Беларусі, але і ў самой Польшчы. На думку доктара гісторыі з Гданьска Лены Глагоўскай, кожная падобная публікацыя на гістарычную тэматыку, якая выходзіць у цяперашняй Беларусі, у асяроддзі гісторыкаў Польшчы ўспрымаецца не толькі са здзіўленнем, а менавіта як вяртанне ў заідэалагізаваныя часы савецкага таталітарызму.

Юры Гумянюк

Вачыма еўрапейца

Сейм аб Беларусі

Польскія палітыкі ўсё часцей і часцей пачынаюць гаварыць аб Беларусі. Хутчэй уцякаюць яны ад спробы адназначнага акрэслення, як павінны выглядаць адносіны еўрасаюзнай Польшчы да гэтай краіны, у адзін голас выказваючы перакананне, што без захавання там дэмакратычных працэдур няма гаворкі аб якім-небудзь набліжэнні на афіцыйным узроўні, па-за супрацоўніцтвам на рэгіянальным (самаўрадавым) ці падтрымкай, напр., гуманітарнай. Некаторыя палітычныя партыі стараюцца — як гэта калісь мовілася — умацаваць супрацоўніцтва з беларускай апазіцыяй. У апошні час найбольш актыўныя ў гэтым пытанні — групоўкі парламенцкай апазіцыі, якія, згодна з публічнай думкай, маюць вялікія шанцы пераняць уладу пасля, пэўна, парламенцкіх выбараў у наступным годзе. Гаворка тут аб Грамадзянскай платформе (PO) і Праве і справядлівасці (PiS). Група дэпутатаў ад Платформы ўнесла ў Сейм пастанову „ў справе незахоўвання правоў чалавека і грамадзяніна ў Беларусі". Прадстаўляе іх віцэ-маршалак Сейма Дональд Туск. Пазітыўна да заявы аднеслася камісія замежных спраў, якую ачольвае Ежы Яскерня з Саюза левых дэмакратаў, а ад яе спікерам з'яўляецца Марэк Юрэк з Лігі польскіх сем'яў (LPR). У пастанове сцвярджаецца: „Сейм РП з трывогай назірае за апошнімі падзеямі ў Беларусі, якія сведчаць аб парушэнні грамадзянскіх правоў і абмежаванні правоў грамадзян". Было падкрэслена, што неспакой польскага Сейма выклікае асабліва прымяненне беларускімі ўладамі „працэдур, якія могуць давесці да дэлегалізацыі дэмакратычных апазіцыйных партый і накладвання новых абмежаванняў на свабоду дзеяння медыяў, няўрадавых арганізацый і вышэйшага школьніцтва". Дэпутаты салідарызуюцца з усімі, хто прагне прысутнасці Беларусі ў грамадзе свабодных дзяржаў, маючы ў памяці жэсты салідарнасці ў змаганні за свабоду ў часы камунізму ў Польшчы.

У выказванні для Інфармацыйнага агенцтва радыёвяшчання Дональд Туск падкрэсліў, што прыняць такую пастанову прасілі беларускія апазіцыйныя дзеячы, якія адчуваюць сябе бездапаможнымі пры ўсё мацнеючых адміністрацыйных рэстрыкцыях з боку ўлад. У пасланні да польскіх дэпутатаў яны напісалі: „Ваша падтрымка якраз цяпер будзе вельмі важнай дапамогай у нашым змаганні за дэмакратычныя перамены ў Беларусі, таму разлічваем на вас".

— Сімвалічная дапамога, калі яна салідарная, можа быць вельмі моцнай зброяй, — дадае віцэ-маршалак.

У сваю чаргу, на думку Рафала Садоўскага з Асяродка усходніх студый, „Польшча можа стараца стымуляваць змены ў Беларусі", гучна выказваючыся аб парушэнні правоў чалавека і падтрымліваючы няўрадавыя арганізацыі і апазіцыйныя партыі.

Актывізаванне жэстаў польскіх палітыкаў у адносінах да Беларусі якраз цяпер — невыпадковае. Ужо неўзабаве, бо 17 кастрычніка, будуць там праводзіцца парламенцкія выбары. Усё паказвае на тое, што апазіцыйныя партыі будуць мець праблему каб пераскочыць „выбарчы парог", і справа тут не толькі ў працэнтным парозе. Аляксандр Лукашэнка заявіў ужо таксама, што зробіць усё, каб кіраваць наступную кадэнцыю. У сваю чаргу Уладзімір Пуцін, хоць бы праз сустрэчу ў Сочы, паказвае, што не намерваецца адпусціць і вызваліць са сферы расійскіх уплываў сваіх саюзнікаў па СНД, не толькі, дарэчы, Беларусі, але і Украіны, якая ўсё радзей усміхаецца да краін Заходняй Еўропы.

У польскай палітычнай рэальнасці такія жэсты таксама не без значэння. Хоць яшчэ няярка відаць, але і тут рушыла ўласная парламенцкая выбарчая кампанія. Было б, аднак, нядобра, каб беларуская справа стала адным з яе элементаў. Быў бы гэта аргумент дзеля выкарыстання супраць уласнае апазіцыі адміністрацыяй прэзідэнта Лукашэнкі. Таму добра было б, каб паплыў з польскага Сейма аднагалосны акт салідарнасці з дэмакратычнымі сіламі ў Беларусі. Падтрыманы, дарэчы, ужо пазіцыяй Еўрасаюза.

Мацей Халадоўскі

Гадзіннік на ліпе

— Ты б нагавіцы надзеў, — упамінае былога вайскоўца бабуля ў хустцы, — а то дзяўчына злякаецца.

Сцяпух З. не зусім голы, на ім сінія штонікі-стрынгі ў белыя хмаркі і цёмныя акуляры на носе. Сёння жара, таму салярны касцюм гаспадара, як і ўсё апошняе, цалкам на месцы.

— У чым справа? — дзядзька падымаецца з ложка і папраўляе прычоску, завершаную тоненькай коскай. У кухні пахне сочывам з лясных малін. Над табурэткай, дзе стаіць вядро з вадой і бляшаны кубак, красуецца вышыванка з жураўлінай парай.

— Я хаджу па ваколіцы і лічу буслоў.

— Белых ці чорных? — Сцяпух З. іранічна ўсміхаецца.

— Мёртвых...

Настрой рэзка мяняецца, Сцяпух З. штосьці мармыча пад носам. Жорстка хапае коціка за хрыбет і шпурляе ім цераз заслоненыя радзюжкай дзверы.

Следам коціка і я, хоць з уласнай ініцыятывы, выматваю на панадворак.

* * *

— А што, не асцерагаў? — рагоча сусед вайскоўца, — а не казаў, што гэта стары псіх!

Мікіта Р. — так завуць суседа — не можа стрымацца ад смеху. У руках сякера. На выпадак — як кажа — калі б той заатакаваў мяне.

— Каторы з іх, — думаю, — больш паранены лёсам?

Мікіта Р. робіць усё, каб паказаць сябе ў ролі ахвяры.

— Апошняй радасці мяне пазбавіў, — пачынае жаліцца былы вясковы настаўнік, рэдактар гміннай газеты і ў апошнія гады народны паэт.

Справа ідзе пра буслоў, якіх нібыта пастраляў Сцяпух З. За гэты ўчынак экс-вайскоўца ўжо „абшмаравалі" гмінная і рэгіянальная прэса.

— Тут усе ведаюць як было, — хіхікае Мікіта Р. — Добра, што экалогіяй пачалі цікавіцца!

Нашы героі жывуць ва ўрочышчы Ліпы. Навокал пушча і зубры, дзікі ды алені. Зімой не прайсці, не праехаць.

— Вінаватая зайздрасць, — кажа Мікіта Р. і раскрывае старонкі сваёй газеты „Гонар". Паміж паведамленнямі пра залатыя юбілеі і продаж куранят, вершаваная рыфмаванка п.з. „Zegarek na lipie".

Чытаю і ледзь не...

— Ну, і як? — просіць ацэнкі паэт-аматар.

— Я не разбіраюся ў паэзіі.


МІРАСЛАЎ ЗДРАЙКОЎСКІ

— У нас не ўсіх друкуюць, — ганарыста адзначае Мікіта Р.

* * *

Сядзім пад ліпай, на якой разыгралася не даказаная трагедыя. Праўда, ніхто не бачыў мёртвых буслоў. Найбольш верагодная версія маці Сцяпуха З., якая частуе мяне яблыкамі і малінавым сочывам.

— Мой сын не пакрыўдзіць нават мухі, — лагодна талкуе старэча, — ён нешчаслівы, самотны.

Сцяпух З. семнаццаць гадоў пражыў на Памор'і. Вярнуўся дажываць пад родную страху, — як сам кажа, — каб апекавацца старой маткай. Яшчэ раней з'ехала за акіян ягоная жонка з дачкой: Mam dosyć życia z dzikim kacapiskiem!, — прасіпела на развітанне. У Амерыцы чакаў яе найлепшы калега Сцяпуха З. І як тут у СЯБРОЎСТВА верыць?!

— А з бусламі было зусім інакш, як пісалі ў газетах, — апраўдвае маці сына.

— То я табе раскажу, — прапануе Сцяпух З., ужо апрануты і ў каўбойскім капелюшы. Я — першая журналістка, якая завітала ў Ліпы.

— Я ацаліў гонар буслоў, — Сцяпух З. какетліва папраўляе капялюш.

— Якім чынам?

— Ноччу ўзлез на дрэва і моцна іх напалохаў. Каб ужо адляцелі. Няма ім ніякай крыўды, маладыя ўжо лёталі. Пяць разоў палохаў... аж вывеліся.

Былы вайсковец закурвае цыгарэту „Monte Carlo".

— Як прачытаў яго вершы ў той няшчаснай газеце, то думаў што... памру. Тры дні ганяла. Ванітаваць хацелася.

Сцяпух З. не абы-хто ў літаратуры.

— У войску я культработнікам працаваў, — успамінае, — ладзіў вечарыны з пісьменнікамі, апекаваўся газетай, у якой друкаваліся творы калег-парашутыстаў.

— А вы таксама друкаваліся?

— Было такое! — ажыўляецца экс-вайсковец. — Раз нават на першую старонку ў „Żywią i Bronią" паставілі.

— Пра што быў ваш верш?

— Пра буслоў.

З недалёкага лесу даносіцца брэх лісіцы.

* * *

У Ліпах сапраўды паэтычны куточак — усюды прыгажосць, дзе вокам кінеш. Ліпы, бярозкі, сосны, хвойкі, жоўтыя вяргінні пад акном. Час ад часу праз хутар прабяжыць вавёрка. Застракоча сарока.

— Jak widzę piękność w całej ozdobie tych naszych dwóch chat, to muszę to przelać na papier, — заклінаецца Мікіта Р. Цяжка тут улавіць раўнавагу, хоць пасля прачытання вершаў больш схіляюся сімпатыяй у бок экс-вайскоўца. Мікіта Р. прыкмячае змену майго настрою. Каб заваяваць мой давер, апавядае пра інтымнае жыццё.

— Чаму не ажаніўся і не абзавёўся сям'ёю? — расказвае вясковы рыфмаплёт. — Бо сустракаў у жыцці адны к...

Расказ былога настаўніка адбіваецца ад мяне быццам гарох ад сцяны. Раней, у суседняй вёсцы, прадставілі яго як адзінага гея ў парафіі. А тут у расказе адны к..., хоць іх ракам у Маскву стаўляй.

— А, можа, надрукуеце мае вершы ў сваёй газеце? — прапануе Мікіта Р. — Імі ўжо і ў Гайнаўцы цікавіліся.

Дзядзька тыцкае мне картку з шэдэўрам „Гадзіннік на ліпе".

* * *

Мікіта Р. адвозіць мяне „малюхам" на прыпынак, пяць кіламетраў лесам. Квітнеюць верасы. За плячыма шэры хвост пылу. Гутарым пра паэтычны конкурс для вяскоўцаў імя Меланні Бужынскай у Моньках. Мой герой, вядома, паслаў і туды свае творы, хоць сваё ведае:

— Bez znajomości dzisiaj nie wygrasz.

Просіць прабачэння, што піша толькі па-польску: Ale moje serce i tak jest na wostokie, — дэкляруе.

Пасля візіту на лясным хутары я хворая і „wstrząśnięta poezji dreszczem".

Ды і Мікіта Р. не дае спакою — звоніць удзень і ўночы і ўсё чытае свае вершы. Адзін з іх пачынаецца:

O, piękna i rezolutna pani redaktor Ewo,
Jesteś jak nasze białowieżskie drzewo,
Co swym szelestem i cieniem czarujesz
A potem w białorusińskiej „Niwie"
wiersze ulubionego poety wydrukujesz.

— Сапраўды, экстра! — хвалю і ўпамінаю: — Ale my nie drukujemy polskich wierszy.

— Pani jest białoruską nacjonalistką! — крычыць у трубку Мікіта Р.

Пад уплывам шантажу, а асабліва ўяўлення, якая пагроза для мяне з боку зайздроснага экс-вайскоўца, адкрываю свету „Гадзіннік на ліпе":

Boćku! Nasz przyjacielu drogi,
Witaj kolego z zamorskiej drogi.
Znów żeś po srogiej zimie,
Zawitał ty w nasze progi.

Na lipie twe gniazdo stare
Tutejszy podlaski dom.
Tu dziatek gromadkę wypieścisz,
Płazy pozbierasz z łąk.

A gdy o świcie powitasz,
Klekotem wesołym jak deszcz,
Zerwę się bez budzika na nogi.
Bo wstrząśnie mną rześki poezji dreszcz.

Wiem, że jesienią jak zaczną się chłody,
Ty emigrujesz na ciepły ląd,
Więc proszę mój przyjacielu drogi.
Zachowaj ostrożność wśród amerykańskich
rakiet i bomb.

Ева Сцепанюк

Знікаюць усё новыя цягнікі

Шэсць рэгіянальных спалучэнняў ад 1 верасня прапала з падляшскага раскладу ПКП. Сярод іх — спалучэнні ў пасляабедзенны час Кузніца-Беластоцкая — Саколка — Кузніца-Беластоцкая. Чатыры чарговыя маюць быць ліквідаваны ад кастрычніка. Не будуць хадзіць рэйкавыя аўтобусы на шляху Гайнаўка — Семяноўка.

Як даведаліся мы неафіцыйна, Прадпрыемства рэгіянальных перавозаў ПКП у Беластоку хацела б, каб ужо ад кастрычніка была ліквідавана адна трэцяя спалучэнняў, значыць, больш за трыццаць. Няма на гэта, аднак, згоды таго, хто дае датацыі на перавозы — Падляшскай маршалкоўскай установы (ПМУ). Увесь час стаіць яна за зменамі ў раскладзе язды, а не за простай ліквідацыяй. Хоча дастасаваць курсіраванне цягнікоў да г.зв. патокаў, значыць, патрэб пасажыраў.

— Не можа быць так, як на шляху Гайнаўка — Цісоўка, дзе галоўным чынам задарма ездзяць працаўнікі чыгункі, а ўтрыманне спалучэння каштуе некалькі соцень тысяч злотых. Тым больш, што ПКП не ўяўляюць магчымасці звароту коштаў за бясплатныя пераезды сваіх работнікаў, — сказаў „Ніве" Яраслаў Ідзькоўскі, дырэктар дэпартамента інфраструктуры ПМУ.

Канчаткова, новы расклад язды, дагавораны паміж ПКП і ПМУ, мае абавязваць ад 14 снежня. Маршалкоўская ўстанова хоча ўтрымаць 105 спалучэнняў (на гэта ёсць грошы), але ў іншых чым дагэтуль гадзінах ад'ездаў і прыездаў цягнікоў.

— Чыгунка павінна панізіць кошты. Цяпер мела 10 мільёнаў страт. Пасля аналізу аказалася, што ўдалося знайсці шэсць мільёнаў. Мы прызначылі на будучы год, падобна як і сёлета, 11 мільёнаў на чыгунку, — тлумачыў дырэктар Ідзькоўскі.

(мах)

Звонкія песні

Прыгожыя беларускія песні плылі-луналі па Старым Ляўкове (Гайнаўскі павет) у апошнюю сёлетнюю жнівеньскую нядзелю. Войт Нараўчанскай гміны і Беларускае грамадска-культурнае таварыства арганізавалі ў тамашнім амфітэатры беларускі народны фэст. Канцэрт вяла Галена Рэент.

На сцэне на працягу трох гадзін выступілі мясцовыя фальклорныя калектывы „Цаглінкі" са Старога Ляўкова і „Нараўчанкі" з Нараўкі. Прыехалі маладзёжныя эстрадныя гурты „Лучына" і „Зорка" з Беластока ды капэла з Дубін. Спявалі яны па пяць і па сем песень. Сваім выканаўчым майстэрствам заваражыла слухачоў беластоцкая „Лучына". Яна і была „зоркай" культурна-забаўляльнага мерапрыемства ў Ляўкове.

Надвор'е было ласкавае, сонечнае ды цёплае. Прыемна і весела было пасядзець (гмінныя ўлады паклапаціліся пра масіўныя ды моцныя лавы) у цянёчку дрэў і асаладзіць сабе свабодны час мілагучнымі песнямі. Рэпертуар быў багаты. Хто хацеў, дык мог купіць сабе магнітафонныя касеты з запісамі найпрыгажэйшых мелодый.

Вечарам пачаліся танцы пад гукі інструментальна-вакальнай групы „Зорка". Працягнуліся яны далёка за поўнач. **(мох)**

Забытая брама

Перад школьным будынкам у Старым Ляўкове (Гайнаўскі павет) знаходзіцца вялікая драўляная брама з чатырохпакатым дашкам, крытым гонтай. Стаіць яна сама менш 60 гадоў. Гэтыя вароты можна лічыць помнікам старадаўнасці. Апошнім часам забытыя яны. У дашку дзіркі, гонта струхлела.

Вароты з дашкам на салідных чатырох стаўбах з'яўляюцца, несумненна, цікавым архітэктурным аб'ектам у вёсцы Старое Ляўкова. Брама захавалася ў памяці шматлікіх выпускнікоў стараляўкоўскай школы, якія выехалі далёка адсюль.

Брама патрабуе неадкладнага рамонту. З такой прапановай выступіў на сесіі Гміннай рады ў Нараўцы 30 жніўня г.г. жыхар Ляўкова. **(мох)**

Найлепшыя брыджысты

Каманда спартыўных брыджыстаў „Зубр" у Гайнаўцы выступае ў II ваяводскай лізе. У брыджы сярод удзельнікаў ва ўзросце да 25 гадоў пара Кшыштаф Ажахоўскі і Себастыян Тамашэўскі заваявала званне I віцэ-чэмпіёна Падляшскага ваяводства.

Брыджысты сустракаюцца на турнірах у гайнаўскай кавярні „Алімп" кожнага тыдня ў панядзелак а гадз. 17^{45}. Да першай дзесяткі брыджыстаў належаць: Дарыюш Бухвальд, Адам Худэк, Лявон Свентахоўскі, Марэк Васілюк, Чэслаў Пяхоцкі, Аляксандр Тапалеўскі, Міраслаў Гурэцкі, Аляксандр Лашчук, Ян Швед і Адам Малец. **(мох)**

Бельскія пажарнікі

Пажарнікі — выдатныя людзі, якіх ахвярная служба карыстаецца пашанай грамадства. У іх радах зберагаецца і развіваецца дух аказвання дапамогі ўсім патрабуючым.

У леташнім, 2003 годзе, у пажарах на тэрыторыі Бельскага павета загінула адна асоба, а ў дарожных выпадках — сем (годам раней было 9 смяротных ахвяр, з чаго дзве ў пажарах), раненні атрымалі 55 асоб — 4 у пажарах і 51 у час мясцовых пагроз (годам раней 76, з чаго 4 у пажарах). Усіх раненых выратавана, аднак пазней не ўсе выжылі, напр. ад апёкаў.

Згодна інфармацыям павятовага каменданта Дзяржаўнай пажарнай аховы Яна Барташука, у 2003 годзе пажарныя каманды Бельскага павета прымалі ўдзел у 462 здарэннях (на 37 больш чым годам раней), а ў першым квартале 2004 года — у 79. У мінулым годзе быў 251 пажар, з чаго 2 вялікія пажары ў вясковых гаспадарках. Найбольш пажараў было ў горадзе Бельску (82), у Бельскай гміне 69, у Арлянскай 31 (на 14 больш чым у 2002 годзе). Найчасцей у 2002-2003 гг. пажары ўспыхалі з-за неасцярожнага абыходу дарослых з адкрытым агнём, у тым ліку ад папяросаў і запалак (125), свядомых падпалаў (40), дэфектаў і няправільнай эксплуатацыі электрычных (21) і абагравальных сістэм (21), неасцярожным выпальванні паш дарослымі (9). У першым квартале гэтага года зафіксавана 11 пажараў у горадзе і 4 у Бельскай гміне, а таксама 57 мясцовых пагроз і 2 фальшывыя трывогі (у Бельску). У цэлым 2003 годзе было 5 фальшывых трывог, а ў 2002 — 9; цікава, што не было іх у горадзе і гміне Браньск ды ў гміне Рудка.

Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

Яўген Селіванюк у спаборніцтвах пажарнікаў перамагае намнога малодшых за сябе сапернікаў

Да здарэнняў каманды выязджалі ў сярэднім праз кожныя 19 гадзін, а гэта на гадзіну і 36 мінут менш чым у 2002 годзе. Час даезду да здарэння паменшаў на адну мінуту, сярэдні час вызначэння месца здарэння — на 0,7 мінуты, сярэдняя працягласць акцыі — на 18 мінут. Рост ліку здарэнняў і іх разнастайнасць прымушаюць да пастаяннага аснашчання каманд новай тэхнікай.

У мінулым годзе бельская каманда атрымала цяжкую выратавальна-гасільную машыну з прыводам на бездараж, шмат спецыялістычных гасільных прыладаў, пачалася пабудова будынка Павятовага камандавання, дзе мае быць і Цэнтр інтэграванага ратавання. Купля аснашчэння стала магчымай дзякуючы спалучэнню фінансавых сродкаў з некалькіх крыніц, у тым ліку 400 тысяч злотаў з пазабюджэтных.

Бельскія пажарнікі прымалі ўдзел у спаборніцтвах ваяводскага і цэнтральнага маштабу. Два разы запар яны даказалі сваё першынство ў Падляшскім ваяводстве, выйгрываючы пажарны чэмпіянат ваяводства ў камандным і індывідуальным заліках. Штабны аспірант Яўген Селіванюк стаў чэмпіёнам ваяводства (да таго ён чатыры разы ўдзельнічаў у сусветных пажарных алімпіядах), а аспірант Адам Кучынскі і малодшы піратэхнік Міраслаў Весялоўскі занялі чацвёртае і пятае месцы. Я. Селіванюк, М. Кардзюкевіч і А. Кучынскі прадстаўлялі Падляшскае ваяводства на чэмпіянаце Польшчы ў пажарным спорце. У леташнім ліпені Павятовая каманда суладзіла III павятовыя пажарна-спартыўныя спаборніцтвы добраахвотных пажарных каманд. З ліку дзевяці перамагла каманда з Рудкі перад Орляй і Браньскам.

Міхал Мінцэвіч

Пярэйма-Сафіпаль

У Пярэйме частка дамоў чакае, каб абагрэла іх цяпло нейкай чалавечай душы. У некаторых тлее яшчэ жыццё, а ў некаторых ідзе яно цалкам шпаркім ходам. Маладога чалавека, што з'явіўся на вуліцы, пытаю пра адну патрэбную мне жанчыну. Дакладна яе не ведае, але паказвае мне дзве хаты, у якіх магчыма яна жыве. Пытаю яшчэ пра солтыса.

— А гэта на калёніі, за „заездам", трэба падысці шашою.

З паказаных ім дзвюх хат у адну напэўна ніхто не заглядае, на зарослым панадворку нават следу сцяжынкі не відаць; у другой няма гаспадыні. Іду шукаць солтыса.

Заезны дварок інфармуе пра сябе вялікай шыльдай і замком на дзвярах. Крыху далей, між гаспадарчымі будынкамі, круцяцца людзі. Пытаю пра гастраном.

— Неўзабаве адкрыем, яшчэ дзён некалькі, — тлумачыцца па-нетутэйшаму жанчына пад шэсцьдзесят.

— А чаго тут трэба!? — агрэсіўна пытае маладзён, што спыніў пілаванне драўніны на дыскавай піле.

— Дзе тут солтыс жыве? — пытаю.

— А вунь там, у другой хаце.

Салтысоўская хатка невялічкая, абабітая сайдынгам, навокал чысціня, парадак. Калі падыходжу да дзвярэй, адкрывае іх маладая жанчына. Гэта яна, Ева Данута Толч, солтысам. Пра „Ніву" ніколі не чула, правярае мой білет, запрашае ў хату. У хаце таксама чысціня, аж неяк няёмка ўваходзіць, як у палац які.

У Пярэйме нямнога душ асталося, мо яшчэ з сорак будзе. Пані солтыс, хаця родам з-пад Дубровы-Беластоцкай, лічыць, што пра сваю вёску ведае больш за свайго аўтахтоннага мужа. Не дзівуюся гэтаму яе выказванню, бо відаць, што жанчына яна дзелавітая. Ды яшчэ заяўляе мне, што не ўяўляе сабе жыцця ў горадзе.

У вёсцы ніхто таварным земляробствам не займаецца. Зямлю людзі абрабляюць, бо ж дзе хто трымае сабе кароўку ці крыху курэй. Жыве крыху і маладых сем'яў, равесных салтысоўскай, але зарабляюць яны на хлеб па-за вёскай. Сама пані солтыс таксама, быў час, працавала ў швейнай фірме ў Беластоку, але ў выніку згортвання фірмы страціла там працу.

— Цяпер даглядаю дзяцей, — кажа. — Мусова, вось сыну семнаццаць.

— Ну так, — кажу, — сама ў галаве пеніцца, як у майго.

— Ой, — уздыхае гаспадыня, — калі я гэты перыяд перажыву, то буду жыць сто гадоў!

Пытаю першую асобу вёскі пра назву мясцовасці, якіх дзве: Пярэйма і Сафіпаль.

— Калісь недалёка адсюль быў двор, — расказвае пані солтыс. — Памешчыца была французанкай, называлася Сафі. Частку маёнтка, дзе цяпер вёска, яна прадала сялянам, што прыехалі сюды з-пад Саколкі. І яна паставіла ўмову, што вёска мае называцца ад яе імя.

— А Пярэйма? Мо таму, што яны перанялі ейныя ўладанні?

— Мабыць так. Некалькі гадоў назад беларускія дзеячы хадайнічалі за тое, каб афіцыйна вёску называць не Сафіпалем, але менавіта Пярэймай. Але пасля абмеркаванняў пагадзіліся, што і цяперашняя назва мае сваё абгрунтаванне.

Развітваюся з гаспадыняй, бо ж так даглядаць дом і наваколле патрэбны ёй час. Калі б сядзела адно перад тэлевізарам, як гэта часам бывае, не сачыла б яна так зорка за парадкам і ў сям'і, і ў хаце, ды і жыццём вёскі не цікавілася б. Пытаю яшчэ пра суседскі заезны двор.

— Каб весці той бізнес патрэбны вялікія грошы, — з нейкім скептыцызмам кідае мне. Мо і не падабаецца ёй патэнцыяльнае суседства гаманлівай установы гарадскога тыпу ў яе даведзеным на падабенства раю вясковым зацішку.

Пакуль што вадзіцелі не звяртаюць увагі на вялікую шыльду. Мо і не адпаведнае там месца для такой установы недалёка ад дзяржаўнай мяжы. Бо ж на мяжы трэба спыняцца, а то і добра пачакаць; каму яшчэ захочацца траціць час другі раз, калі *czas to pieniądz*.

Аляксандр Вярбіцкі

Абаронцы роднай мовы

— Ці ёсць ужо ў вас беларуская мова? — званю ў Бабікі на Сакольшчыне. Сёння другі дзень новага 2004/2005 навучальнага года.

— Як добра што звоніце! — вітае мяне дырэктар школы Гражына Куклік. — Я якраз і думаю пра вас.

— А ў чым справа?

— Патрэбны нам настаўнік.

На ўрокі беларускай мовы ў Бабіках запісалася за дваццаць дзяцей — гэта трэцяя частка ўсіх навучэнцаў.

Яшчэ ў той самы дзень знаходзім настаўніка.

Я ўпрошваюся на першы ўрок беларускай мовы.

* * *

Пытанне пра навучанне беларускай мовы стаўлю таксама дырэктару Пачатковай школы ў Нурцы-Станцыі (вясной для „Нівы" выказвалася войт гміны, якая была зацікаўлена ўвядзеннем беларускай мовы ў школу.)

— Pani chyba pomyliła nas z innym Nurcem, — чую ў адказ.

— Не, не памыліла.

— My mamy rosyjski i angielski.

— А ці былі нейкія старанні наконт беларускай?

Дырэктар школы шчыра ашарашаны.

— U nas ten problem nie istnieje.

— У час апошняга перапісу аж 16,36 працэнта ад агульнай колькасці насельніцтва дэкларавала сябе беларусамі.

Дырэктар, Роберт Сабяшук, мяняе фронт:

— To znaczy, pięć lat temu przeprowadzaliśmy taką ankietę wśród rodziców i nikt nie był zainteresowany.

Я таксама шчыра ашарашана. За пяць гадоў памяняліся не толькі бацькі. Мы, здаецца, у Еўрасаюзе!

* * *

Званю яшчэ ў Залукі. Год таму адрадзілася там беларуская мова. Палова навучэнцаў наведвала ўрокі, дзеткі выпісвалі „Ніву", прымалі ўдзел у беларускіх дэкламатарскім і тэатральным конкурсах. Словам, мелі кантакт з іншымі беларусамі.

— W tym roku już nie będzie języka białoruskiego, — кажа дырэктар школы. — Bo odeszła nauczycielka.

Прапаную дапамогу:

— Я нават сёння магу вам знайсці настаўніка.

Пані дырэктар сумняваецца:

— To muszę jeszcze dzieciom rozdać karteczki, aby rodzice wyrazili zgodę.

Пытаю пра найважнейшае: чаму школа не пакарысталася асветнымі субвенцыямі на навучанне беларускай мовы.

У адказ:

— Бо, каб патрабаваць субвенцыю, трэба мець дзевяць гадзін у тыдзень — у нас было шэсць.

Я шчыра ашарашана. Прычым тут гадзіны? Хопіць сем навучэнцаў і дырэктар абавязаны арганізаваць урокі (у Беластоку ў ПШ н-р 4 дырэктар арганізаваў урокі нават для трох навучэнцаў!)

Званю яшчэ да настаўніцы беларускай мовы. Спадарыня Яўгенія Грушэўская не крые хвалявання.

— Я сама гаварыла дырэктарцы, што павяду ўрокі беларускай мовы, — кажа. — Дзеці вельмі ахвотна прыходзілі на мае ўрокі, рады былі і іх бацькі.

Спадарыня Грушэўская ўпершыню ад мяне чуе, што не будзе ўжо ў іх школе беларускай мовы.

— Што мне рабіць? — пытае.

Адсылаю да нашых асветных арганізацый — БГКТ і Беларускага асветнага таварыства.

У першую чаргу таму, каб названыя арганізацыі прыгадалі сабе, ці ёсць у нас яшчэ нешта такое як навучанне беларускай мовы!?

Ганна Кандрацюк

У Гродне засталося 660 маленькіх беларусаў

Паводле чыноўнікаў, прыблізна ў 60% агульнаадукацыйных школ краіны год таму навучанне ішло пабеларуску. Рускамоўных было напалову менш. Такія прапорцыі, як мяркуецца, зафіксуюць і ў сёлетнім верасні. Аднак вось што кажуць людзі: „У Гродне няма ніводнай школы з беларускай мовай выкладання..." — „Большасць настаўнікаў беларускай мовы не з'яўляецца сябрамі ТБМ і варожа ставіцца да дзейнасці нашай арганізацыі..." — „Бацькі таксама «заганяюць цвічок» у іхныя галоўкі — мова аджыла сваё, яе ўжо няма..."

Шмат хто не верыць статыстыцы. І дарма: у краіне сапраўды 2 700 школ беларускамоўныя. А цалкам рускамоўных прыкладна 1 350. Астатнія паўтысячы — з выкладаннем часткі дысцыплін на адной, а часткі — на другой мове. Гэта праўда. Але не ўся. Бо чыноўнікі не кажуць пра іншае: матчына слова выціскаецца на перыферыю, у малакамплектныя школкі.

— У Гродне няма ніводнай школы з беларускай мовай выкладання, ёсць толькі асобныя класы, — гаворыць сябра Абласной рады Таварыства беларускай мовы Алесь Крой. — Фактычна ў горадзе засталося 660 вучняў, якія вывучаюць усе прадметы па-беларуску. Гэта ў асноўным старэйшыя класы, выпускныя. Ужо ў наступным годзе колькасць вучняў будзе значна меншая, і яна ўпершыню будзе меншай, чым колькасць вучняў, якія вывучаюць усе прадметы на польскай мове ў польскамоўнай школе ў Гродне.

Алесь Крой згадвае, што роўна 10 год таму тут было 27 беларускіх школ з 33. І ўжо тады гродзенская інтэлігенцыя хвалявалася: гэтага мала! 200 аўтарытэтных тамтэйшых жыхароў падпісаліся пад лістом да Аляксандра Лукашэнкі з заклікам падтрымліваць і пашыраць адукацыю на роднай мове. Аднак пасля ініцыяванага прэзідэнтам рэферэндуму 1996 года сітуацыя радыкальна памянялася: за выключэннем некалькіх „змешаных", школы сталі цалкам рускамоўнымі.

— Хіба гады чатыры, як няма болей першых класаў, — кажа Алесь Крой. — Былі выпадкі, калі нават сябры Рады ТБМ не маглі ўладкаваць сваіх дзяцей, каб тыя атрымалі беларускамоўную адукацыю.

Hrodna News, Рэгіянальны інфармацыйны сэрвіс, 01.09.2004

Бельская асвета

Сёлета ў школах падлеглых Бельскаму старостве адукуецца 4 150 вучняў (у гэтым ліку 150 у непублічных школах), якіх навучае 315 настаўнікаў; у школах працуе таксама 112 асоб адміністрацыйнага і дапаможнага персаналу.

Асветная сістэма Бельскага павета ахоплівае 11 адукацыйных устаноў: 2 самастойныя агульнаадукацыйныя ліцэі, 5 комплексаў звышгімназічных школ (тэхнікумы, агульнаадукацыйныя ліцэі, профільныя ліцэі і асноўныя прафшколы), Комплекс спецыяльных школ (пачатковая школа, гімназія, асноўная прафшкола), Школьны пансіён, Псіхалагічна-педагагічная кансультацыя і Цэнтр практычнай адукацыі. Пры Комплексе школ н-р 3 імя Падляшскай зямлі ў Бельску і пры Комплексе сельскагаспадарчых школ імя Кшыштафа Клюка ў Рудцы працуюць прышкольныя інтэрнаты. Адукацыйную прапанову ўзбагачаюць непублічныя школы: І Прыватны агульнаадукацыйны ліцэй і Постліцэйнае вучылішча для дарослых у Бельску ды Прыватны завочны агульнаадукацыйны ліцэй у Боцьках.

Па сутнасці кожная з 11 асветных устаноў змагаецца з многімі праблемамі, кранаючымі стану будынкаў і іх аснашчэння. У пяці выпадках гэта патрэба дацяплення будынкаў і аднаўлення іх вонкавага выгляду, зношаная ваконная сталярка; у трох выпадках адсутнічае спартыўная база. У многіх школах зношаныя ацяпляльнае, санітарнае, ваданоснае і электрычнае абсталяванні.

Праблемы ІІ Агульнаадукацыйнага ліцэя імя Браніслава Тарашкевіча, дзе вучыцца 470 вучняў і столькі ж прадбачваецца ў 2005 і 2006 гг. (паводле павятовага староства):

— незадавальняючы тэхнічны стан будынка,

— ацяпленне і аднаўленне вонкавага выгляду,

— замена часткі падлог,

— частковае аднаўленне электраабсталявання.

Прадбачваюцца наступныя інвестыцыйныя задачы ў павятовых асветных установах (на 2004-2006 гг.):

— мадэрнізацыя школьнага стадыёна пры Комплексе школ н-р 1 у Бельску,

— пабудова спартыўнай залы пры Агульнаалукацыйным ліцэі н-р 1 у Бельску,

— мадэрнізацыя памяшканняў з-пад былой кацельні ў Школьным пансіёне ў Бельску на адпачынкавы асяродак,

— аднаўленне палаца Асалінскіх у Рудцы з навакольным паркам.

Міхал Мінцэвіч

Хварэць за нашых!

Закончыліся XXVIII Алімпійскія гульні. Пара адпачыць аматарам спорту і тэлевізарам, а атлетам рыхтавацца да новых спаборніцтваў.

Беларусам у Польшчы прыходзілася сачыць за выступленнямі польскіх і беларускіх майстроў спорту. Польскія спартсмены выступілі няўдала і заваявалі толькі 10 медалёў, у тым ліку 3 залатыя. Спартсмены з Беларусі змагаліся лепш і атрымалі 15 медалёў: 2 залатыя, 6 сярэбраных і 7 бронзавых.

Каралевай спрынту на афінскай алімпіядзе стала брэстаўчанка Юлія Несцярэнка. Яна выйграла ўсе забегі на стометроўцы і даказала, што можна перамагчы цёмнаскурых бягуняў.

Шмат каму і з беларусаў не паспрыяла спартыўнае шчасце. 9 майстроў спорту з Беларусі занялі 4-ыя месцы, а гэта значыць, што былі толькі крок ад медалёў.

Не заўсёды суддзі ў Афінах былі аб'ектыўнымі ў адносінах да беларускіх гімнастаў і баксёраў і яўна заніжылі ацэнкі, але чаго ў спорце не бывае.

15 медалёў для Беларусі не так мала, хоць у Нацыянальным алімпійскім камітэце разлічвалі на 25. Выйграць на алімпіядзе вельмі цяжка, бо тысячы спартсменаў з усяго свету мараць аб медалях і грашах. Цяпер чэмпіёны выдатна аплачваюцца дзяржавамі.

Астаецца толькі пажадаць лепшых дасягненняў польскім і беларускім спартсменам на будучай алімпіядзе ў Пекіне.

Мікалай Варанецкі

Юбілей

У жыцці бываюць розныя юбілеі, але пра такі арлянскі, які ў 32 нумары „Нівы" („Сустрэча пасля паўвеку") апісаў Аляксей Мароз, мне яшчэ нідзе не давялося чытаць. Хвала ягоным арганізатарам!

Маім дубіцкім равеснікам стварыць такое мерапрыемства немагчыма, бо прамінуў час пяцідзесяцігоддзя ды амаль усе мае настаўнікі і выхавацелі паўміралі. Няма ўжо слаўнага Уладзіміра Шклярука, які быў і здольным ніўскім літаратарам, аўтарам „Оды на салому", якая заваявала цікавасць і пашану чытачоў „Нівы". Паўміралі таксама Станіслаў Ендрас з Гайнаўкі і мой сваяк Трахім Панфілюк. Не ведаю, дзе рэшта маіх настаўнікаў ды і мае сябры не ўсе ў ліку жывых. Хаця і ў нашай школе адбываліся цікавыя падзеі ды павыходзілі з яе слаўныя людзі, сумняваюся ці такую сустрэчу магчыма было б наладзіць. Дзеля гэтага патрэбнае зацікаўленне хаця б „Нівай", а ад гэтага мае школьныя сябры далёка.

Мікалай Панфілюк

Правер свае косці

27 верасня г.г. Гмінны асяродак здароўя ў Нараўцы запрашае на даследаванне мінеральнай шчыльнасці касцей (badanie densytometryczne). Запісы ўсіх зацікаўленых у дзень даследавання. За дэталёвай інфармацыяй трэба звяртацца па тэл. 685 80 10. **(мох)**

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

Мал. АНІ БАЧЫНСКАЙ і МОНІКІ ЯКІМЮК

БЕЛАРУСІК СМЕЛЫ

унуку Мікіце прысвячаецца

Адкажы мне, хто ты?
Беларусік смелы.
Сцяг які твой родны?
Бел-чырвона-белы.
Дзе ты жывеш?
Жыву між сваімі.
Што найдарожша?
Свабода Радзімы.
Як быць свабодным?
Змагацца за Волю.
Што зычыш людзям?
Лепшую долю.
Што табе годнае?
Родная мова.
Што хочаш слухаць?
Роднае слова.
Здрады баішся?
Не, не баюсь.
У што ты верыш?
У Беларусь.
Што тут тваё?
Мой край Прынямонскі
Хто табе прыклад?
Кастусь Каліноўскі.

Лявон Карповіч (Лунна)

Вершы Віктара Шведа

Першы дзень у школе

Са школы па занятках
Дамоў прыйшоў сыночак.
— Што новага, дзіцятка? —
Татулька ведаць хоча.

— Даведаўся я ў школе,
Татулька мой харошы,
Што іншым дзецям болей
Даюць кішэнных грошай.

Можа скажаш, колькі важыш

Запыталіся Рыгора:
— Скажы, колькі важыш зараз?
— Важу кілаграмаў сорак,
Ды, вядома, у акулярах.

— А без акуляраў колькі? —
Сябра з гумарам пытае.
— Без акуляраў, мілы Колька,
Сваёй вагі не адчытаю.

Польска-беларуская крыжаванка № 37

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.



Адказ на крыжаванку н-р 33: Опт, блеск, лаза, вышыванка, маталка, не, парк, Ян, абклад. Прымак, шар, лытка, кава, залік, банк, каша, яна, канец.

Чарнакорань пурпуровы

Ты пытаешся, чаму, калі ўсе расліны — прыгожыя і добрыя, сярод іх ёсць атрутныя?

Нават у атрутнай расліне няма ні дабра, ні зла — дабро ці зло з яе дапамогай робіць чалавек. Нават самая моцная атрута можа быць добрым лякарствам — трэба толькі правільна ёю карыстацца. Ну, а злы чалавек — той сапраўды з дапамогай зёлак шмат пакуты можа прынесці...

Жыў некалі ў гэтай пушчы такі злыдзень. Звалі яго Нічыпор, і з усяе акругі хадзілі да яго лячыцца. Але куды часцей, чым лячыцца, бегалі да Нічыпора па іншых патрэбах — кагосьці прысушыць да сябе, прыварожыць, або, наадварот, пазбавіцца непатрэбнага кахання, зрабіць так, каб суседская ніва не ўрадзіла, а суседскія куркі несціся перасталі... Ды якіх толькі гадасцяў людзі адзін аднаму не зажадаюць!

І шмат каму дапамог спраўдзіць злыя пажаданні Нічыпор. Вось толькі людзі рэдка ўсведамляюць, што злыя пажаданні ніколі не прыносяць шчасця. Зло заўсёды вяртаецца туды, дзе было спароджанае.

Але ўсё роўна знаходзіўся нехта, хто, зваблены хцівасцю або крыўдаю, ішоў па змрочнай дарозе між сівых ялінаў да хаты ведзьмака, якая амаль хавалася ў зарасцях калючага глогу. І бедны, і багаты, і цёмны, і вучоны не ўбераженыя ад спакусы папрасіць дапамогі ў чорнай сілы. Не толькі пешкі прыходзілі да Нічыпора — прыязджалі да яго і ў карэтах.

Аднойчы такая багатая карэта спынілася перад Нічыпоравым домам. Пан, гаспадар карэты, не шкадаваў залатых талераў, бо не золата было прычынай яго пакут, а каханне.

Ды каб сох пан па якой радавітай паненцы — не так крыўдна было б. Але закахаўся ён у дачку вясковага каваля, вясёлую

Мітусня

(песня гурту „Н.Р.М.")

Мітусня кароткіх дзён
Адыходзіць у небыццё.
Нехта шле табе праклён
На ўсё тваё жыццё.

Зноў малююць абразы,
Над царквою ставяць крыж.
Прыкусіўшы свой язык,
Ты пакорліва маўчыш.

Прыпеў:
Паглядзі, што вакол:
Хто за кім, хто каго...
Гэты свет — супраць нас,
Супраць нас.

Нам не трэба шмат казаць
І рабіць наадварот,
Нам не трэба прадстаўляць
Свой заторганы народ.
Гэта наш з табою час,
Гэта наш з табою лёс.
Мы жывем апошні раз,
Мы жывем у поўны рост.

Прыпеў...

Каціна радзіна

Юлітка прытуліла коціка,
а гэты коцік — кошачка,
белая ў плямінкі — адна краса,
бедная ды галодная.
Дарастала яна, прыгажэла
ў Юліткі, якая яе глядзела.
Котка Кіця, бо так называлася,
нарадзіла дзетак нямала.
Трое прыгожых, пярэстых,
якіх назвалі... далматынцамі.

Мартына Ева Леанеўска,
Гімназія ў Нараўцы

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Гімназісткі з Дубіч-Царкоўных

Час рыцараў

Марка Пола

Самым вядомым падарожнікам сярэднявечча быў Марка Пола. У сваё першае падарожжа ён рушыў у 15 гадоў! Яго першай экзатычнай краінай, адгароджанай ад свету мурам, быў старажытны Кітай.

У канцы XIII стагоддзя Кітаем кіраваў унук Чынгісхана — Кубілай. Рымскі папа даведаўся, што там жывуць хрысціяне. Ён падумаў, каб аб'яднацца з Кубілаем і разам абараняцца ад туркаў. Дзеля гэтай місіі паслаў у Кітай сваіх дэлегатаў.

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Паўля Віталеў — дэкламатарка з Орлі

Ёсць звесткі, што ў адной такой паездцы апынуліся бацька і дзядзька нашага славутага падарожніка. Яны ўзялі хлапчука з сабой у далёкую дарогу.

Марка Пола пражыў у Кітаі аж 17 гадоў. Нейкі час ён нават уладарыў адным з гарадоў Кесарства Сярэдзіны.

У Італію Пола вярнуўся ўжо як багаты і шырокавядомы чалавек. Славу прынесла яму „Кніга", у якой Пола апісаў свае кітайскія прыгоды. Напісаў ён у ёй пра навуковыя ды тэхнічныя вынаходствы ў краінах Азіі, пра космас, пра тэхніку друкавання кніг і картаў...

(працяг будзе)

Зорка

Чалавек з Беларусі

Недзе трыццаць гадоў таму ў невялічкай беларускай вёсцы Н. малады чалавек развітваўся са сваёй сям'ёй. Маці з сястрой моцна плакалі, а бацька маўчаў, не адазваўся ні слоўцам. Сын Міша збіраўся ў Амерыку, за хлебам. Яму было ўсяго 23 гады. Ляцеў сам, хаця нікога там не ведаў, не ведаў нават англійскай мовы. Што ж, захацелася грошай, дык ляціць. Бацькі шмат часу збіралі на білет, хаця ў хаце заўсёды жылі сціпла.

— Ой, сыночак, сыночак, — гаварыла маці, — толькі пішы!

— Мама, не плачце, — прасіў Міша, — буду пісаць і прысылаць вам грошы. Усё будзе добра, не хвалюйцеся.

Міша паехаў. Спачатку часта пісаў, як і абяцаў маці. Неўзабаве знайшоў сабе добрую працу і быў вельмі шчаслівы. Бацькі цешыліся таксама. Маці не раз хвалілася суседкам, як жыве яе Мішачка.

Мішы сапраўды паводзілася нядрэнна. Ён прысылаў грошы і з таго часу бацькам стала лягчэй жыць. Яны ўвесь час абнаўлялі сваю гаспадарку, а сястра Ніна пачала нават вучыцца ва універсітэце. Суседзі скоса на іх спаглядалі, усё з зайздрасці. Ад нейкага часу многа памянялася ў гэтай сям'і.

З часам, аднак, Міша пісаў усё менш і менш. Мінула многа гадоў. Бацькі мелі ўжо хатні тэлефон, але Міша ніколі ім не пазваніў. Напісаў толькі, што прыедзе на Каляды. Радасці ўсёй сям'і не было канца. Маці не магла дачакацца таго дня, калі зноў пабачыць свайго каханага сына.

Ніна са сваім мужам паехала ў Мінск на аэрадром сустракаць свайго брата. Якое ж было яе здзіўленне, калі ён адазваўся. Ён вельмі дрэнна гаварыў па-беларуску. Міша не забыўся, усім прывёз падарункі. Бацькам падарыў прыладу для нарыхтоўкі чыпсаў і фрытак. У кожным амерыканскім доме гэта аснова. Ніне прывёз моднае і шыкоўнае адзенне. Усё, здаецца, было як трэба. Усёй сям'ёй з'елі каляду і пачалі спяваць калядкі. Міша іх ужо не памятаў, але сказаў, што заспявае амерыканскую і заспяваў. Ён забыў яшчэ шмат іншых рэчаў. Размаўляючы з бацькамі дзіўна выкручваў языком, не памятаў імёнаў сваіх дзядзькоў і цётак. З вялікім захапленнем расказваў пра амерыканскія ўлады, звычаі, крамы. Усё больш і больш наракаў на Беларусь і жыццё тут. Бацька пільна прыглядаўся свайму сыну, часта жмурыў вочы і круціў галавой.

Не мінулі тры месяцы, а Міша зноў збіраўся за акіян. Маці цешылася і гаварыла бацьку:

— Вось якога пана зрабіла з нашага сына Амерыка.

— Не! Гэта ўжо не мой сын — ціха, быццам самому сабе, прашаптаў бацька і горка заплакаў.

Ягада

прыгажуню Агатку. Штопраўда, нават у каралеўскіх палацах не бачылі такога хараства, як у Агаткі. Але дарэмна распісваў пан дзяўчыне, як пекна стане выглядаць яна ў панскіх строях, як паплыве лебедзем па бліскучым паркеце бальнай залы. Толькі смяялася дзёрзкая Агатка — не пасуюць лясной галубіцы павіныя пёры, не нажыцца дачцы каваля ў княжацкім палацы.

І, вядома, нават самыя вялікія багацці не разгладзяць зморшчаны, як печаны яблык, твар яе вяльможнага кавалера.

І пан толькі зубамі скрыгатаў ад таго, што Агатка — не ягоная халопка, і прамінулі тыя часы, калі панаў дзед мог паслаць пахолкаў па любую дзяўчыну ў наваколлі, і ўвобмірг тыя кінулі б сплаканую красуню гаспадару пад ногі.

Цяпер жа заставалася пану спадзявацца толькі на дапамогу чорных сіл. Бо і непатрэбная была яму сплаканая прыгажуня — хацеў ён убачыць у падобных на дзве цёмныя зоркі вачах любасць, пачуць хоць адно ласкавае слоўца... Ды каб спрах той ляснік Янка, які насіў пекнай Агатцы скуркі гранастаяў і срэбных лісіц, і не аднаму багатыру лоб разбіў толькі за тое, што той прыпыніўся з мройным выразам твару насупраць кавальскае хаты.

Выслухаў Нічыпор панскія скаргі са сваёй заўсёднай змрочнай усмешкай, нават не зірнуў на жменю золата, што сыпануў госць на стол. Папрасіў якую-небудзь рэч дзяўчыны — і пан дастаў з-за пазухі пунсовую хустку. Нічыпор падвёў пана да вялікага люстэрка, кінуў хустку ў чару з вадою, сыпануў нейкіх зёлак, зашаптаў таемныя словы... Зашумеў за вокнамі лес, затрашчалі кусты глогу ля хаты, нібыта нехта прабіўся скрозь іх. Паверхня люстэрка пабегла хвалямі, як паверхня ракі, і скрозь пералівісты туман паказаўся дзявочы мілы тварык... Здавалася, Агатка знаходзіцца тут, у хаце ведзьмака, але чамусьці нікога не заўважае, нешта задуменна напявае, пераплятае густую цёмную касу, часам усміхаецца патаемным думкам...

— Гэта твая каханая? — прыглушаным голасам спытаў Нічыпор.

— Так, яна! — з гонарам адказаў госць. — Ну што, прызнайся, стары, бачыў хоць калісьці падобную прыгажосць?

— Не, ніколі не бачыў я такой красуні, — павольна адказаў Нічыпор. — А я шмат бачыў прыгажунь на сваім вяку — і не толькі з гэтага свету. І яшчэ скажу. Не для цябе яна, пане.

— Што ты вярзеш?! — абурыўся наведнік. — Я сюды прыйшоў не за тваімі павучэннямі! Не для мяне такая краля, бачыце... А для каго? Для гэтага лайдака Янкі?

— Ні для цябе, ні для яго, — пагрозна прагаварыў Нічыпор. — А для мяне. Так што забудзься і на кавалёву дачку, і на дарогу да майго дому.

Чым настрашыў Нічыпор госця — невядома. Але ехаў пан з нашага лесу так хутка, што ледзь з карэты не вываліўся. І адразу за мяжу з'ехаў. А ў наступную нядзелю адбылося дзіва — у вёсцы з'явіўся Нічыпор, якога там не бачылі, мусіць, гадоў трыццаць.

(працяг будзе)

Людміла Рублеўская

Гарадок святкуе

Традыцыяй ужо стала святкаванне „дня нараджэння" места Гарадок. І хоць Гарадок сёння — ужо нават, мабыць, і не мястэчка, а гмінная немалая вёска, з ледзь пазначаным месцам па замку Хадкевічаў, дзе нават і штотыднёвы базар страціў местачковую важнасць і шумнасць, але аб Гарадку і ў Гарадку зусім не ціха. Ледзь адгрымела „Басовішча", ледзь астыла паляна ва ўрочышчы Барык пасля апошняй „Сяброўскай бяседы", як у Гарадок паплылі новыя госці. Сваякі, суседзі, замежнікі, а нават і зноўку багатая чарада чыноўнікаў. Былі, а як жа ж, і з ваяводства — сам ваявода Марэк Стшалінскі ўзвышаўся над гэтым тлумам ураднікаў і самаўраднікаў. Нагода была святочная і прыемная — у гэты сонечны дзень, у 506-годдзе Гарадка, пачаў сваю дзейнасць амфітэатр над Зарэчанскім вадасховішчам. Азерца чыстае, атачэнне яго травяніста-падстрыжанае, ёсць месца дзе і раскласціся на пледах, і паставіць свой столік, а на агароджаным абшырным пляцы — лавачкі і будыначак сцэны. Тут зараз жа і лясок. Мабыць, гасцей было не менш ці не больш, чым на святах арганізаваных у Барыку, але палічыць іх можна было ўсіх, ніхто не схаваўся ў інтымныя кусцікі як ва ўрочышчы. Традыцыйна, найбольш кідаліся ў вочы аграмадныя цацкі для дзяцей — высачэзныя арэлі з гумамі, вялізны вышчараны кіт, з якога можна было з'язджаць. Поўна крамаў з халодным пітвом і гарачай ежай, латарэйны ларок, рэкламны кіёск Гарадоцкай гміны, шатры для гасцей...

Фота МІРЫ ЛУКШЫ

Каб падрыхтаваць свята, дык і наробішся! А ці хто ўспомніць гаспадыню... — Мірка Антановіч і Галіна Мялешка завіхаюцца ля пліты

Дзеля свята рукі прыклалі ўсе — таксама і малавідочныя ў гэты дзень сціплыя вясковыя гаспадыні, якія заранёў рыхтавалі пачастунак, да таго вучні, паліцыя, пагранічнікі... Свята было, традыцыйна, пагарадоцку — пад музыку духавога аркестра, з трэскам феерверкаў. Пасля таго, як войт і шэфіха Гміннай рады разрэзалі стужку, асвячэння месца бацюшкамі абедзвюх канфесій, прамоў і падзякаў спонсарам і госцям, на сцэну выйшаў „Расспяваны Гарадок". Ушанаваў калектыў яшчэ раз сам ваявода, уручыўшы медалі за шматгадовую плённую дзейнасць гэтым моцным спявачкам і беларускам. Да калектыву далучыліся ў гэты дзень і вечар таксама гарадоцкія „Хутар", „Асенні ліст", залучанскія „Каліна" з „Калінкай", „5 set 5", гурт „RIMA", вучні з Пачатковай школы і з гурту з ГОК у Гарадку, паэты са згуртавання народных творцаў „Каласы" і, вядома, „Прымакі". Дапамаглі, традыцыйна ўжо, запрошаныя курпі — з Баранова (кабарэ), з Завад, са Збуйнай. Да таго беластоцкія „Лучына" і „Зорка", бельскі „Ранок", не гаворачы аб „прымацкай" падмозе — Багусі і Эвеліне Карчэўскіх. А яшчэ ж і „Шкляры" з беларускай Бярозаўкі, і славутая „Kasa Chorych". Музычна-танцавальнае шоу „Цыганскія чары" працягвалася аж поўную гадзіну! І духавы аркестр быў (Васількаў), і цырк быў, і паліцыйныя паказы, і хіп-хопавыя танцы. Сярод гэтага вясёлага тлуму снаваўся вусаты акцёр у світцы ды з брылём — Віктар Манаеў з Тэатра імя Янкі Купалы, і распытваў пра тое, хто такі прымак і якое жыццё такога. Здымаў усё гэта Максім Куроўскі з групы Беларускага тэлебачання ў Мінску, з рэжысёрам Уладзімірам Бокунам і рэдактаркай Аленай Антанішынай. Заглянулі яны не толькі да „Прымакоў", але наведалі старажылку паэтку Надзею Дудзік, і паэта-разбяра Яна Федзюкевіча, і еўрапейскага гаспадара Уладзіміра Лукошыка. Жыве Гарадок!

Міра Лукша

Фота МІРЫ ЛУКШЫ

Віктар Манаеў распытвае Надзею Дудзік пра гарадоцкае сёння і ўчора

Фота МІРЫ ЛУКШЫ

Ішлі на свята ўсе — і малыя, і вялікія

Паэтам трэба ганарыцца

Дзякуючы „Ніве" траплю ўрэшце ў Тарнопаль, так думаў я, калі выбраўся ехаць на бацькаўшчыну ў гэтым годзе. Там не толькі жыве сярод лясоў, палёў і лугоў, але і беларускія вершы складае Уладзімір Гайдук. Чаму дзякуючы „Ніве"? А таму, што з зацікаўленнем прачытаў я рэпартаж Міры Лукшы пра Міраслава Зубрыцкага з Баб'яй Гары і яго аграмурыстычную кватэру. Калі я глянуў на карту „Szlaki rowerowe w regionie Puszczy Białowieskiej", убачыў, што з Баб'яй Гары ў Тарнопаль вядзе веласіпедны шлях. Такім чынам з'явілася нагода зведаць не толькі маляўнічы куток між Семяноўкай і Белавежскай пушчай, але і наведаць селяніна-паэта.

Да Уладзіміра Гайдука выбіраўся я ўжо ў мінулым годзе са зборнікам вершаў „Пах аернага хлеба", каб атрымаць ад знакамітага паэта аўтограф і пагутарыць з ім.

Аднак тады я проста не ведаў, як з Гайнаўкі дабрацца на аўтобусе ў Тарнопаль, а растлумачыць не вельмі хто мог. Жыве не так ужо далёка ад Гайнаўкі — ад Цэнтра беларускай культуры — неардынарны творца, але сцежка з таго ж Цэнтра зусім не працёртая.

Мне здаецца, што паколькі ў Тарнопалі жыве знакаміты беларускі паэт, інфармацыя аб гэтым павінна быць занесена ва ўсе турыстычныя даведнікі. Гайнаўскі Цэнтр беларускай культуры павінен тым ганарыцца, бо творцаў Гайнаўшчына так многа не мае.

Быў цёплы сонечны ранак, калі завітаў я на веласіпедзе да Уладзіміра Гайдука, каб пры нагодзе спаткання атрымаць аўтограф на зборнічку яго вершаў. А як жа, за хвілінку часу, якую мог мне адвесці паэт, упісаў прысвячэнне. Крышку пагутарылі. Крышку, бо паэт якраз выбіраўся ехаць па сена. „Выбач, — кажа паэт, — але буду заняты да вечара пры ўборцы сена. Добрая пагода, трэба гэта выкарыстаць". — „Пэўна, — разгублена кажу я. — Сена трэба збіраць, калі сухое". І замест запрапанаваць яму помач, успеў я яшчэ толькі павіншаваць паэта з 63-й гадавінай нараджэння ад сябе, „Нівы" і ўсіх, так думаю, яе чытачоў. І так мы развіталіся.

Шкада, што не ўдалося крыху даўжэй пагутарыць. Мабыць, удасца пры іншай нагодзе.

Міхась Куптэль

Хлебнае свята ў Цеханоўцы

8 жніўня ў Музеі сельскай гаспадаркі ў Цеханоўцы адбыўся чацвёрты выпуск мерапрыемства „Падляшскае свята хлеба". Да імпрэзы прымеркаваны былі дажынкі, якія сталіся нагодай для спаткання са знаёмымі і напамінам аб старажытнай сялянскай традыцыі.

Галоўным героем святкаванняў быў хлеб — сімвал дастатку, сытасці, гасціннасці. Пададзены са шмальцам дапраўленым часнаком, са шкваркамі, кіслымі агуркамі, або змочаны вадой і пасыпаны цукрам, пашмараваны мёдам або парэчкавым варэннем смакаваў надзвычай добра.

Вялікай цікавасцю карысталіся паказы пячэння хлеба. Пад дзве тысячы жыхароў Падляшша прыглядалася традыцыйнаму пячэнню хлеба — на лісцях, з дадаткам мёду, маку, арэхаў, карамелю, семечак, цыбулькі. Сотні прадуктаў, іх колеры, формы здзіўлялі — аднак самым папулярным быў традыцыйны бохан спечаны на лістку хрэну.

— Жыхары Падляшша — незалежна якога яны веравызнання і нацыянальнасці, католікі ці праваслаўныя, палякі, беларусы ці ўкраінцы, — гаварыў бурмістр Цеханоўца Славамір Лапяк, — з дзеда прадзеда звязаны з вёскай. Адтуль нашы карані, а традыцыю ведаць нам трэба ўсім і таму „Свята хлеба" — гэта свята ўсіх сялян.

Хлебнае свята арганізатары спрытна аб'ядналі з дажынкамі. Быў конкурс на найпрыгажэйшую „пэрэпэліцю" — букет са збожжа і кветак. Смех і гарачыя апладысменты мужчынскай часткі публікі атрымала „oborywanie przepiórki" — польскі абрад, калі на канец жніва маладую жнею працягвалі праз усю пожню, „каб шчасце і ўраджай не пакідалі гаспадара".

Апранутыя ў народныя ўборы гаспадыні частавалі хлебным квасам і малосольнымі агуркамі. Прытым можна было пачуць такія словы: „Mamusiu, to takie pyszne! A ty potrafisz tak zrobić?" І не адна мама ішла паглядзець як пякуць хлеб і пірагі вясковыя гаспадыні. Прысутным да танца іграли народныя гурты, а маладыя дзяўчаты плялі вянкі з кветак... Гэта былі дажынкі!

Паўліна Шафран-Асташэвіч

Трыццаць шэсць гадоў свайго жыцця Мікалай Авенарыус звязаў з Драгічынам. У гэты час раскопваў ён курганы, наглядаў за стратыграфіяй культурнага слоя, фіксаваў адкрытыя археалагічныя помнікі, ствараў калекцыі старажытнасцей, цікавіўся нумізматыкай і сфрагістыкай, публікаваў артыкулы ў пецярбургскіх выданнях...

Даследчык Драгічына

Сто семдзесят гадоў таму, 12 верасня 1834 г. у Царскім Сяле нарадзіўся рускі педагог, археолаг і краязнавец Мікалай Авенарыус. Пасля заканчэння гістарычна-філалагічнага факультэта Галоўнага педагагічнага вучылішча ў Пецярбургу працаваў ён настаўнікам, а потым Міністэрства народнай адукацыі камандзіравала яго ў Нямеччыну і Швейцарыю для вывучэння пытання падрыхтоўкі настаўнікаў сярэдніх асветных устаноў. Пасля вяртання з-за мяжы ў 1864 г. заснаваў ён Маладзечанскую настаўніцкую семінарыю, а ў 1864-1885 гг. працаваў інспектарам Александрыйска-Марыінскага інстытута ў Варшаве, а затым Беластоцкага настаўніцкага інстытута.

Працуючы ў Варшаве і Беластоку Авенарыус сваю актыўнасць не абмяжоўваў толькі да асветных спраў. Апрача публікацыі матэрыялаў па педагогіцы ў айчынных і замежных часопісах, пісаў творы для дзяцей, склаў вучэбную карту Еўрапейскай Расіі, вёў археалагічныя доследы. Трыццаць шэсць гадоў свайго жыцця (1864-1900) Мікалай Авенарыус звязаў з Драгічынам. У гэты час раскопваў ён курганы, наглядаў за стратыграфіяй культурнага слоя, фіксаваў адкрытыя археалагічныя помнікі, ствараў калекцыі старажытнасцей, цікавіўся нумізматыкай і сфрагістыкай, публікаваў артыкулы ў пецярбургскіх выданнях.

„У граніцах горада на мысе-астанцы правага берага Буга знаходзіцца гарадзішча (Замкавая гара) — астаткі старжытнарускага Драгічына, — пісаў Мікалай Авенарыус. — Была гэта авальнай формы (100 х 60 м) пляцоўка пасялення, распаложаная 36 м над узроўнем ракі і адрэзаная ад берагавога плато глыбокім равом. Вал, абліцаваны звонку глінай, захаваўся толькі з палявога боку. Значная частка гарадзішча размытая ракой". Менавіта на водмелі мясцовыя жыхары пастаянна знаходзілі выпаласканыя вадой розныя прадметы, у тым ліку свінцовыя пломбы, з якіх выплаўлівалі ружэйныя кулі і якія выкарыстоўвалі ў якасці грузілаў для рыбалоўных снасцей або прадавалі ці ахвяроўвалі аматарам даўніны. Такім чынам пачалі складвацца калекцыі археалагічнага матэрыялу.

Да нашага часу захавалася больш за 10 тысяч драгічынскіх пломбаў. Сам Авенарыус сабраў іх каля 900 экземпляраў, з ліку якіх 700 адправіў у Імператарскую археалагічную камісію ў Пецярбург. На пломбах, якімі значыліся тавары высыланыя праз мытню ў Драгічыне, знаходзіліся кірылічныя літары, выявы крыжа, рукі, рукі з мячом, галавы ў шлеме, арла, чалавека і інш.

У лістах да калег-прафесіяналаў археолаг-аматар Мікалай Авенарыус апісваў свае пошукі і іх вынікі. У Аддзеле пісьмовых крыніц Дзяржаўнага гістарычнага музея ў Маскве захоўваецца абшырная падборка пісем адрасаваных рускаму гісторыку права, археолагу і архівісту Дзмітрыю Самаквасаву (1843-1911). У гэтай калекцыі знаходзяцца таксама лісты Мікалая Авенарыуса (апублікаваў іх Б. Д. Яршэўскі ў зборніку „Материалы научной конференции «Новгород и Новгородская земля. История и археология»", Ноўгарад 1997). А вось вытрымкі з пісем Авенарыуса Дзмітрыю Самаквасаву:


Hubert Śmietanka (http://mazowieckie.zamki.pl/html/drohiczyn.html)

21 лістапада 1886 г. Беласток — Варшава: „Знайшоў я ў тутэйшых краях вельмі цікавае ў археалагічным плане месца — Драгічын на заходнім Бугу. Я правёў там некалькі дзён мінулым летам і прывёз адтуль некалькі соцень прадметаў (зброя, упрыгожанні і т.п.), сабраных на берагу ракі. Прадметы вымыты веснавым разлівам Буга з прапаленага наскрозь нагорнага берага".

23 снежня 1886 г. Беласток — Варшава: „Вы пішаце, што калі прыедзеце ў Драгічын, то не пазней 20 ліпеня. Я прыеду сюды 11 або 12 ліпеня. Буду шчаслівы правесці з Вамі хоць тыдзень. Канешне, гэта не Каўказ з яго невычэрпнымі археалагічнымі скарбамі, але ва ўсякім выпадку Вы і там знойдзеце многа цікавага. Курганы, гарадзішча, цэлы падземны горад, падвалы на Замкавай гары, магілы каменнага перыяду, два яцвяжскія могільнікі".

Без даты, Беласток — Варшава: „З далучаных да ліста здымкаў Вы бачыце, што я лета зноў правёў у Бельскім уездзе Гродзенскай губерні. Маёй рэзідэнцыяй быў той жа Драгічын. (...) На састаўленай мною карце Бельскага ўезда нанесена каля 50 могільнікаў, у якіх я налічыў каля 3 000 магіл. (...) Драгічын даў мне гэтым летам багаты плён дзякуючы шчодраму разліву Буга, які бязлітасна падмыў берагавую частку гарадзішча. Улічваючы ўсе дробныя прадметы, я сабраў далёка больш за 1 000 штук. Канешне, дублікатаў безліч. Адных нажоў аднолькавага фасону больш за 60, прасліц столькі ж, некалькі соцень пацерак, свінцовых пломбаў 685 экз. Адным словам, мне прыйшлося цэлы месяц сартаваць гэтыя рэчы і паслаць у Піцер два пуды з лішнім. (...) Знайшоў я і маманцавыя косці, але пакінуў іх сабе, паколькі Камісіі яны непатрэбны".

30 жніўня 1887 г. Беласток — Варшава: „Прыложаныя чатыры рымскія манеткі прашу Вас далучыць да Вашай калекцыі рэчавых доказаў аб руху славян з берагоў Дуная ў другім стагоддзі. Яны знойдзены селянінам у адлегласці чатырох вёрст ад Саколкі Гродзенскай вобласці ў ліку тысячы падобных жа манет".

11 лістапада 1887 г. Беласток — Варшава: „У мяне пасля заканчэння археалагічнага сезона прыбываюць нейкія рэчы, знойдзеныя ў раскапаных мною магілах: менавіта некалькі срэбных пярсцёнкаў, пару крэсіваў, і, галоўнае, каралі з сініх і фіялетавых пацеркаў. Справа ў тым, што ў адным вялікім могільніку прыйшлося мне працаваць пасля працяглых дажджоў, калі зямля пераўтварылася ў кісель, а магілы былі неглыбокія. Вось я і даручыў аднаму селяніну, які прасіў у мяне кніжак для вясковай школы, паслаць дзяцей у сухую пару ў мой могільнік і яшчэ раз прасеяць зямлю, за што абяцаў прыслаць кнігі. Цяпер дзеці маюць кнігі, а я — рэчы".

16 лістапада 1887 г. Беласток — Варшава: „Паколькі Вы збіраеце даныя аб рымскіх манетах знойдзеных у Расіі, то я магу паведаміць Вам, што мне ўчора паказвалі бронзавую манету Веспасіяна, знойдзеную 20 гадоў таму каля вёскі Дабжынева, у сямі вярстах ад Беластока".

7 студзеня 1892 г. Беласток — Варшава: „Вы можа памятаеце гэтыя загадкавыя пломбы, якія я знайшоў у Драгічыне. З гэтай пары пломбы зацікавілі многіх. Нехта Леапардаў у Кіеве напісаў аб іх многа недарэчнасцей, спачатку ў асобнай брашуры, а потым у выдадзеным ім зборніку. Іншы кіяўлянін, Балсуноўскі, выдаў іх на 20 вялікіх табліцах і пісаў аб іх у адным кракаўскім часопісе, а цяпер рыхтуе аб гэтым жа прадмеце большы рускі артыкул. (...) Гэтых прадметаў толькі ў адзін Кіеў было адпраўлена больш за 2 500 штук і ўся драгічынская басаногая моладзь заўзята збірае іх, здзіраючы з аматараў вялікія грошы. На канец, у снежні 1891 г., як мне піша Балсуноўскі, кіеўскі прафесар Лучыцкі прачытаў аб гэтых пломбах даклад у Таварыстве прападобнага Нестара Летапісца, у якім даказваў тоеснасць гэтых пломб з хатнімі маркамі, абвінавачваючы ўсіх пісаўшых аб іх, у тым ліку і мяне, у незнаёмстве з гэтымі маркамі. Верагодна, што на гэтую думку навёў яго артыкул пакойнага Катлярэўскага і, узяўшы з універсітэцкай бібліятэкі цытаваную Катлярэўскім кнігу Міхельсона (...), адразу стаў поўным ведаў і розуму чалавекам. Паколькі я распаліў гэты сырбор, дык нельга мне маўчаць".

Мікалай Авенарыус, які памёр 17 ліпеня 1903 г., не дачакаўся канчатковага вывучэння пломбаў. Нягледзячы на тое, што пломбы былі ўведзены ў навуковы абарот яшчэ ў 60-я гады XIX стагоддзя, а даследчыкі не раз падымалі спробы вывучыць іх, да гэтай пары няма поўнай іх навуковай сістэматызацыі і класіфікацыі. Відаць, чакаюць свайго даследчыка.

Віталь Луба


http://mazowieckie.zamki.pl/html/drohiczyn.html

Драгічын у пачатку XX стагоддзя

Прыватны сайт, створаны прыхільнікамі экуменізму — ідэі прымірэння і адзінства ўсіх хрысціян незалежна ад канфесійнай прыналежнасці...

adzinstva.at.tut.by

Апошнім часам у прэсе вельмі актыўна асвятлялася падзея перадачы папам рымскім Іаанам Паўлам II Казанскай іконы Божай Маці. Факт без сумнення дастойны павагі і ўсялення надзеі, што колішнія сумныя моманты ў гісторыі праваслаўя і каталіцызму не знойдуць працягу ў гісторыі. Таму цікава даведацца, чым праяўляе сябе экуменічны рух у Беларусі, дакладней у беларускамоўным Інтэрнэце.

Калі карыстальнік набярэ адрас http://adzinstva.at.tut.by, то перад яго вачыма адкрыецца сіне-блакітна-белае выяўленне „да краёў" напоўненае тэкстам. Уверсе на блакітным фоне размешчана назва сайта „Сайт хрысціянскага адзінства". З левага боку — вузкае сіняе поле, дзе месцяцца рубрыкі і банэры, а з правага — асноўны тэкст. Менавіта аб ім спачатку і пагаворым.

Адразу ў вочы кідаецца фотаздымак стылізаванага Распяцця, да якога прыйшла жанчына. Над здымкам надпіс: „Слава Ісусу Хрысту", а пад ім тэкст-прывітанне ад распрацоўшчыкаў сайта. Яны паведамляюць, што гэта „прыватны сайт, створаны групай хрысціян, прыхільнікаў экуменізму — ідэі прымірэння і адзінства ўсіх хрысціян незалежна ад канфесійнай прыналежнасці. Мы хочам, каб хрысціяне былі разам, каб не жыла ў сэрцах вернікаў нецярпімасць і варожасць да братоў-хрысціян. Еднасць мы разумеем не як аб'яднанне ўсіх канфесій і дэнамінацый у адну, не, мы гаворым пра еднасць усіх хрысціян у Любові, Міры і Згодзе, у разнастайнасці культурных традыцый і абрадаў. Хочам, каб мы, хрысціяне, не варагавалі, не змагаліся паміж сабой, а ядналіся ў Любові Хрыстовай паводле Яго запаветаў". Мэты, як бачым, самыя добрыя. Таму „пагартаем" старонкі сайта.

Пачнем з „Навінаў". Дарэчы, у скароце, яны падаюцца яшчэ на галоўнай старонцы. Каб даведацца больш падрабязна аб іх, трэба клікнуць на „Навіны". Але тут нас чакае не надта прыемны сюрпрыз. Хоць распрацоўшчыкі і пішуць, што абнаўляюць гэтую рубрыку штотыднёва, на самой справе, апошняе абнаўленне адбылося два месяцы таму. З гэтай прычыны аб апошніх экуменічных падзеях, пра што казалася ў пачатку артыкула, з гэтага сайта даведацца немагчыма.

Вельмі цікавай падаецца рубрыка „Гісторыя". У ёй апісваецца кароткая гісторыя хрысціянства, узнікненне самога экуменічнага руху і ягоныя набыткі на працягу апошніх дзесяцігоддзяў.

Старонка „Сучаснасць" распавядае пра дзейнасць у Беларусі цэркваў хрысціянскіх канфесій. Тэкст пачынаецца пра праваслаўе, як найбольш пашыранае і старажытнае на беларускіх землях. Побач тэксту змешчаны здымак мітрапаліта Філарэта — першаіерарха Беларускай праваслаўнай царквы.

Далей ідзе расповед аб Каталіцкай царкве. Зноў жа з наяўнасцю фотаздымка яе кіраўніка ў Беларусі кардынала Казіміра Свёнтка. Потым мы можам прачытаць пра беларускіх грэка-каталікаў і цэрквы пратэстанцкіх накірункаў. У самым канцы распавядаецца пра міжнародную экуменічную арганізацыю „Сусветная рада цэркваў".

Рубрыка „Бібліятэка" дае магчымасць пазнаёміцца з друкаванымі матэрыяламі, датычнымі экуменізму. Гэта выступленні на гэтую тэму кіраўнікоў розных канфесій, матэрыялы сабораў, дакументы міжканфесійных сустрэч.

Вельмі цікавай ёсць рубрыка „flash-падарункі" адкуль можна згрузіць у свой камп'ютэр хрысціянскія мультфільмы на беларускай мове.

Уладзімір Лапцэвіч

15 сумарных медалёў (два залатыя, шэсць срэбных і сем бронзавых) прывялі нас да 18-га месца ў агульным медалёвым заліку і да 19-га па ачках...

Беларусь, беларусы...

На звыклых пазіцыях

Афінская алімпіяда завяршылася для беларусаў у адпаведнасці з рэалістычнымі прагнозамі. 15 сумарных медалёў (два залатыя, шэсць срэбных і сем бронзавых) прывялі нас да 18-га месца ў агульным медалёвым заліку і да 19-га па ачках. Пасля нас такія тэрытарыяльна вялікія краіны як Канада, Бразілія, Турцыя, Польшча, Швецыя і многія іншыя, больш развітыя дзяржавы. У параўнанні з мінулымі гульнямі Беларусь засталася на ранейшых пазіцыях — у Атланце—1996 было 15 медалёў, у Сіднеі—2000 — 17. Асобна ў гэтым сэнсе стаяць барселонскія гульні 1992 года, калі высілкамі фенаменальнага Віталя Шчэрбы, які здабыў шэсць залатых узнагарод, Беларусь выйшла на 9-ю пазіцыю ў свеце. У сталіцы Грэцыі наша краіна здабыла медалі ў 9 відах алімпійскай праграмы — акадэмічным веславанні, боксе, веласпорце, грэцка-рымскай барацьбе, дзюдо, кулявой стральбе, лёгкай і цяжкай атлетыцы, веславанні на байдарках. Не спраўдзілі надзеяў плыўцы, гімнасты, тэнісісты, барцы-вольнікі, большага чакалі ад лёгкаатлетаў і стралкоў.

Крок наперад зрабілі баксёры. Працягваючы традыцыі віцебскай школы (яе выхаванец Вячаслаў Яноўскі — адзіны беларус — алімпійскі чэмпіён), на другую прыступку п'едэстала ўзышоў **Віктар Зуеў** (вагавая катэгорыя да 91 кг). Ён паўтарыў свой сёлетні вынік на чэмпіянаце Еўропы. Таксама срэбным прызёрам стаў ураджэнец далёкага дагестанскага Каспійска **Магамед Арыпгаджыеў** (катэгорыя да 81 кг), лепшым вынікам якога да таго было другое месца на чэмпіянаце свету 2003 года.

Зноў трапілі ў прызёры прадстаўнікі беларускай грэцка-рымскай барацьбы. На гэты раз поспех прыйшоў да **Вячаслава Макаранкі** з Гомеля. Чэмпіён Еўропы 2000 года стаў бронзавым лаўрэатам у вагавай катэгорыі да 84 кг. Прыемнай чаканасцю стаў выступ беларускай мужчынскай байдаркі-двойкі. Ураджэнец Калінкавічаў **Раман Петрушэнка** і мінчанін **Вадзім Махнеў** фінішавалі трэцімі на дыстанцыі 500 м. А вось канаіст Аляксандр Жукоўскі паехаў з Афінаў моцна расчараваны — чацвёрты вынік на паўкіламетровай дыстацыі пакінуў нашага спрактыкаванага весляра па-за п'едэсталам. Такі ж самы лёс чакаў юных айчынных гімнастак-„трасцінячак" у камандавым спаборы. А ў асабістым першынстве па мастацкай гімнастыцы лепшая з нашых Іна Жукава стала толькі сёмай.

У выніку дыскваліфікацыі венгерскага кідальніка молата Адрыяна Ануша, які адмовіўся прайсці паўторны допінгавы кантроль, бронзавы медаль **Івана Ціхана** „пераплавіўся" ў срэбны. Не пазбегла скандалу і беларуская дружына. У арганізме Аляксея Ляснічага, які выступаў у скачках у вышыню, было выяўлена забароненае рэчыва — кленбутэрол. А найбольш зганьбіліся на алімпіядзе расійскія, венгерскія і грэцкія спартоўцы, якіх злавілі на допінгу. Праблема ўжывання стымулятараў у спорце набыла такі размах, што змагацца з гэтым становіцца ўсё больш праблемным. На жаль, чысціня алімпійскіх ідэалаў — панятак мінулага. Дзеля адраджэння сумленных прынцыпаў змагання патрэбныя кардынальныя захады розных структураў. Інакш спорт канчаткова ператворыцца ў бізнес, дзе мэта будзе апраўдваць любыя сродкі.

Уладзімір Хільмановіч

Занатоўкі кантрабандыста

„Ашчадны" Сяржук

Скупы плаціць двойчы. Гэтую прымаўку ведае кожны. Але не кожны жыве паводле яе. Сяржук з-пад Іўя ніколі не задумваўся пра філасофію нейкіх там прымавак. Для яго важнымі былі толькі канкрэктныя факты. І калі ён сёння зарабіў тры долары, то лічыў сябе на пяцьдзесят працэнтаў разумнейшым за таго, хто зарабіў толькі паўтара. Людзі на Івейшчыне не ўсе такія. Большасць жыве паводле старадаўняга ліцвінскага светагляду. Для іх важнасць маюць не ўдзёртыя аднекуль грошы, а рэчы больш высакародныя. Прыкладам, ці паважае чалавек радню сваёй жонкі. Або ці не здурэў настолькі, што стаў выпіваць налібоцкай гарэлкі, якая вядомая па ўсёй Беларусі як бакштанская, больш, чым яго старая матуля магла выгнаць.

Сяржук мог выпіць мора, але за чужы кошт. За свае грошы нават не хацеў есці. Пра такіх кажуць, што ён за капейку жабу ў Вільню пагоніць. Апошні раз я сустрэў яго ля выбарчай дзяльніцы на прэзідэнцкіх выбарах 2001 года. Спытаў за каго галасаваў.

— Супраць усіх, — адказаў ён хмура. — Няма там нармальных. Лукашэнка мяжу з Расіяй знішчыў, апазіцыянеры хочуць знішчыць мяжу з Еўропай. А як жыць простаму чалавеку? Межы для таго, каб чалавеку было зручна. Без межаў ён загіне.

Я ледзь не памёр ад смеху. Успомніў адну старую гісторыю. А было так. Неяк надумалася група кантрабандыстаў памяняць свае машыны на лепшыя. Старыя прадалі і накіраваліся ў Нямеччыну купіць новыя. Быў у гэтай групе і Сяржук. Клопатаў з ім было больш чым з немаўлём. Як усе ўжо прадалі свой спірт і цыгарэты, ён яшчэ лётаў па рынках і шукаў дзе гэты тавар каштуе даражэй. Іншыя мусілі чакаць яго два дні. А таму шанцавала. Нават у нейкага выпівохі, што не меў грошай, за кілішак спірту выменяў новенькія пантофлі. Еў ён асобна ад іншых, каб не скідвацца грашамі. Так яму было танней. І ў Нямеччыне, калі ўсе ўжо купілі машыны, Сяржук усё шукаў танней-шую. Мы яму дапамагалі, бо ўжо хацелася дахаты. А раз прыехалі разам, то разам трэба і вяртацца. І знайшлі для яго лепшую чым сабе. І танней-шую. А калі пачулі, што Сяржук хоча застацца яшчэ на дзень, каб пагандлявацца і выгадаць яшчэ пару марак, паўскоквалі мы з зямлі як жабы з балота, у якім бухнуў дынаміт.

— Каб яго зямля завярнула, — зароў што вар'ят Юрась. — Каб яму гэтыя грошы на лекі пайшлі. Не будзем яго чакаць. Хай сам сабе радзіць.

— А я нікога ні пра што не прашу, — спакойна адказвае Сяржук, нібыта ён ужо не скраў у іншых час, нервы і сродкі. — Вы мне толькі растлумачце як ехаць дахаты.

Мы так і зрабілі. Паказалі шлях да аўтабана. Растлумачылі, што па ім ён даедзе аж да Польшчы. А там хай у людзей пытаецца.

Сяржук зрабіў так, як яму раілі. Вось толькі на аўтабане павярнуў не ў той бок. Ехаў ён доўга. Пакуль не скончылася паліва і грошы на яго. І спыніўся недзе пасярод хуткаснай трасы, каля знака, які не дазваляў ехаць менш ста кіламетраў у гадзіну, блізка каля самай заходняй часткі Еўропы. Залез на дах сваёй машыны, сеў і заплакаў.

Першымі яго заўважылі партугальскія паліцыянты. Як толькі высветлілася, што ў Сяржука няма грошай, каб заплаціць за буксіроўку машыны, памаглі яму скаціць яе ўбок і хутка ўцяклі. Потым з'явіліся бандыты, якія размаўлялі па-руску. Доўга білі небараку і, як зразумелі, што грошай няма, вырвалі з машыны магнітолу і паздымалі колы. Потым не так шпарка як паліцыянты, але дастаткова хутка зніклі за далягляд. Затым прыехалі яшчэ нейкія рускамоўныя. Гэтыя, убачыўшы пабіты Сяржуковы твар, усё зразумелі адразу. Нічога не пыталіся, толькі забралі пантофлі і прапалі.

Чым гэта ўсё скончылася б, каб не адзін дальнябойшчык — невядома. Той прапанаваў Сяржука давезці да Беларусі, але за гэта запатрабаваў аддаць яму машыну. Сяржук і плакаў, і на каленях стаяў, але на гэты раз нічога не выгандляваў. Так і даехаў да Беларусі. Без машыны, без грошай, пабіты і босы, праклінаючы тых, хто паздымаў у Еўропе нармальныя памежныя кардоны. Бо каб яны былі, то яго яшчэ на французскай мяжы завярнулі б назад. А як я заўважыў, што ён пацярпеў з-за сваёй скупасці, Сяржук адказаў:

— Не скупы я, а ашчадны. І ніколі не прагаласую за тых, хто нішчыць межы.

Сымон Нальшанскі

ПАЎЛІНА РАІЦЬ

Чалавек па сваёй натуры істота добрая, зычлівая, аднак часам зычлівасць можа абярнуцца супраць яго самога. Напрыклад, сяброўка хоча пазычыць ад нас грошы. Хаця можа быць гэта і невялікая сума, можа здарыцца, што не толькі страцім сяброўку, але і ніколі не атрымаем грошай назад. Каб не рызыкаваць, найлепш спісаць дагавор. Калі дагавор будзе заключаны ў вуснай форме, можна мець клопат з вяртаннем грошай. Калі справа дойдзе да суда, патрэбны будуць сведкі, а на іх пакліканне мусіць згадзіцца даўжнік.

Каб правільна спісаць дагавор, не патрэбны спецыяльныя фармуляры, ні натарыяльны акт, незалежна ад велічыні пазыкі. Дастаткова спісаць дагавор уласнаручна, ясна акрэсліўшы ўмовы пазыкі. Памятайма, што ў дагаворы трэба падаць:

— дакладныя персанальныя даныя: імя, прозвішча, адрас пражывання, ідэнтыфікацыйны нумар (PESEL);

— колькасць пазычаных грошай, у тым назву пазычанай валюты;

— дакладны тэрмін пагашэння пазыкі (у тым інфармацыя ці сплата адбудзецца аднаразова, ці ў ратах, а калі так, тады ў якой велічыні і ў якіх тэрмінах);

— працэнты за несвоечасовую сплату.

Можам таксама дамагацца месячных працэнтаў. Калі аднак баімося, што пазыкаатрымальнік можа мець праблемы са сплатай даўгу, варта раней забяспечыцца. Напрыклад, патрабаваць даць просты вэксаль (бланк можна купіць на пошце). Асоба, якая пазычае ад нас грошы, падпісваецца на чыстым вэксалі, а яго атрымальнік у выпадку праблем упісвае прозвішча гэтай асобы і суму даўгу. На такой падставе суд можа прыняць рашэнне, нават пры адсутнасці зацікаўленых бакоў.

Іншы выхад — запрапанаванне пазыкаатрымальніку вызначыць асобы, якія, як жыранты ў банку, будуць гарантаваць тэрміновую сплату даўгу. Каб гэта мела законную сілу, жырант павінен распісацца на дагаворы. У гэтым выпадку не патрабуецца пасведчанне натарыуса ці трох сведкаў. Такі дагавор павінен таксама ясна акрэсліваць умовы вяртання грошай. Памятайма, што трэба пазначыць дакладны тэрмін сапраўднасці дагавору.

А што рабіць, калі пазыкаатрымальнік не вяртае грошай? Напэўна варта паразумецца, запрапанаваць растэрміноўку пазычанай сумы на раты. Памятайма, што кожнае пагадненне лепшае чым справа ў судзе. Не трацім тады ні часу, ні грошай! Калі аднак не можам ніяк дайсці да паразумення з даўжніком, можам скіраваць справу ў суд — цывільнае аддзяленне ўсеагульнага суда. Калі пазычаная сума ніжэйшая за 30 тысяч злотых, справай займаецца раённы суд. Памятайма, што справа не пачнецца без грошай — будзе гэта 8% ад сумы, якой патрабуем.

Калі суд прыгаворыць даўжніка да вяртання грошай, а той будзе далей замаруджваць справу, трэба звярнуцца да судовага выканаўцы. Калі даўжнік працуе або атрымоўвае пенсію, то доўг будзе спаганяцца з заробкаў або пенсіі. Судовы выканаўца мае права заняць маёмасць даўжніка, напрыклад, машыну, а нават кватэру. Грошы атрыманыя ад продажу маёмасці прызначаюцца на пакрыццё даўгу.

Варта памятаць, што пазычаючы грошы сямейнікам (маці, бацьку, сястры, цесцям) — значыць, асобе з першай падаткавай групы, не адводзім ніякага падатку, калі сума не большая за 9 637 зл. (ад аднаго пазыкадаўцы) або 19 274 (ад некалькіх). Ад такой пазыкі мусім заплаціць 2% падатку (датычыць гэта абодвух бакоў).

Памятайма, што нават найлепшыя сябры, ці нават сямейнікі могуць падвесці наш давер і варта быць на гэта падрыхтаваным.

Паўліна Шафран-Асташэвіч

Віншуем Беларускую газету ў вольным свеце „Беларус" з выхадам 500 нумара і 55-гадовым узростам.

Рэдакцыя „Нівы"

Кантактны пункт па справах культуры плануе сарганізаваць у верасні або на пачатку кастрычніка шэраг практычных заняткаў прысвечаных запаўнянню фармуляраў праектаў у рамках праграмы Культура 2000. Будуць яны праводзіцца ў некалькіх вялікіх гарадах Польшчы. Да ўдзелу хочам запрасіць тыя арганізацыі, якія плануюць рэалізаваць праекты ў 2005 г. У сувязі з гэтым просім да 10 верасня падаваць заяўкі на ўдзел у занятках з указаннем прапанаванага горада іх правядзення. На гэтай падставе будзе створаны дэталёвы план заняткаў з канкрэтнымі месцамі і тэрмінамі.

Інфармацыя на тэму праграмы Культура 2000 знаходзіцца на сайце Кантактнага пункта па справах культуры: **www.mk.gov.pl/pkk** ды на сайце Еўрапейскай Камісіі: **www.europa.eu.int/comm/culture/eac/index_en.html**

Кантактны пункт па справах культуры, e-mail: jsanetra@mk.gov.pl

Вялікае беспрацоўе ў нашым рэгіёне давяло да сітуацыі, што амаль кожны з нас мае сярод сваіх сямейнікаў ці знаёмых асоб, якія шукаюць працу. Каб неяк памагчы такім людзям, вядзем рубрыку „Дапамагаем з «Нівай»". Побач бясплатна будзем змяшчаць аб'явы людзей, якія шукаюць працу або могуць даць працу. Сардэчна запрашаем усіх чытачоў дасылаць у рэдакцыю свае прапановы. Рубрыку вядзе Паўліна Шафран-Асташэвіч, з якой можна кантактавацца па мабільніку нумар 0600 635 425 (або ў рэдакцыі па панядзелках ад 10 да 12 — тэл. 743 50 22).

ШУКАЮ ПРАЦУ

• Жанчына, 34 гады, абслуга камп'ютэра, сярэдняя адукацыя, сумленная і працавітая, шукае працу ў Беластоку, тэл. 746 30 23.

• Маладая жанчына, правы кат. В, добрае веданне рускай і англійскай моў, аператыўная, шукае працу ў Беластоку, тэл. 0 692 660 704.

• Студэнтка маркетынгу шукае працу ў Беластоку, вадзіцельскія правы кат. В, добрае веданне англійскай і рускай моў, абслуга камп'ютэра (інтым і сецевы маркетынг не прапаноўваць), тэл. 0 602 769 109.

• Студэнт шукае працу ў Гайнаўцы, вадзіцельскія правы кат. В, добрае веданне рускай і беларускай моў, абслуга камп'ютэра, аператыўны і ахвотны да працы (інтым і сецевы маркетынг не прапаноўваць), тэл. 0 606 431 022.

• Малады мужчына, 26 гадоў, гандлёвы прадстаўнік — будаўнічыя і хімічныя прадукты, сярэдняя адукацыя, камунікатыўны, правы кат. В, уласная машына, шукае працу ў Беластоку або аколіцах, тэл. 0 508 628 196.

• Мужчына, 34 гады, прадавец, сярэдняя адукацыя, веданне камп'ютэра і англійскай мовы, правы кат. В, патрабуе працу ў Гайнаўцы або ваколіцах Бельска, тэл. 0 651 096 880.

• Мужчына, 48 гадоў, пільна шукае працу ў Бельску, II група інваліднасці, тэл. 0 604 671 311.

• Жанчына, 27 гадоў, вопыт гандлёвага прадстаўніка, без дрэнных схільнасцей, правы кат. В, добрае веданне камп'ютэра, шукае працу ў Бельску-Падляшскім, тэл. 0 694 957 365.

• Інжынер-будаўнік, 30 гадоў, вышэйшая адукацыя, будаўнічыя правы, тэрмінова патрабуе працу ў ваколіцах Бельска-Падляшскага, тэл. 0 508 628 196.

• Жанчына, вышэйшая педагагічная адукацыя, правы кат. В, добрае веданне нямецкай мовы, шукае працу ў Падляшскім ваяводстве, тэл. 0 608 651 478.

• Маладая жанчына без дрэнных схільнасцей заапякуецца дзіцём, вопыт, тэл. 0 602 432 565.

• Малады мужчына, сярэдняя эканамічная адукацыя, шукае працу ў Бельску, тэл. 0 505 568 234.

• Жанчына, 27 гадоў, вышэйшая эканамічная адукацыя, правы кат. В, кніжка здароўя, фіскальная каса (інтым і сецевы маркетынг не прапаноўваць), тэл. 0 506 489 040.

• Маладая жанчына, вышэйшая эканамічная адукацыя, стаж працы ў гандлі, веданне камп'ютэра і абароту гандлёвых дакументаў, шукае працу ў Беластоку, тэл. 0 697 754 188.

• Студэнт шукае працу ў Беластоку, свая машына, вадзіцельскія правы кат. В, добрае веданне рускай мовы, абслуга камп'ютэра (інтым і сецевы маркетынг не прапаноўваць), тэл. 0 603 431 445.

• Жанчына, 25 гадоў, спецыяліст па справах маркетынгу і продажу — вышэйшая адукацыя, веданне камп'ютэра, добрае веданне рускай мовы і тэхнічнай тэрміналогіі, пільна шукае працу, тэл. 0 503 713 915.

• Малады мужчына, 29 гадоў, вопыт працы ў бюро, вышэйшая юрыдычная адукацыя, уласная машына, шукае працу ў Беластоку, тэл. 0 694 744 998.

• Жанчына, 42 гады, шукае працу ў ваколіцах вуліцы Пяста ў Беластоку, танна прыбярэ, зварыць, заапякуецца дзіцём або старэйшай асобай, тэл. 710 90 03.

• Абітурыентка сацыялогіі шукае працу ў Беластоку, абслуга камп'ютэра, санітарны мінімум (інтым і сецевы маркетынг не прапаноўваць), тэл. 0 698 285 964.

Дапамагаем сабе ўзаемна

У Бельску: 720 20 06

• Сям'я патрабуе помачы ў выглядзе яды і гігіенічных сродкаў.

• Сям'я просіць дапамогі ў выглядзе старой мэблі і адзення для дзяцей ва ўзросце 7, 9, 12 гадоў.

• Сям'я просіць дапамогі ў выглядзе дзіцячага адзення, пасцелі і яды.

• Сям'я патрабуе старога халадзільніка і яды.

• Старэйшае сужонства, якое выхоўвае чацвёра дзяцей, патрабуе цёплага адзення для 12-гадовага хлопца і 15-гадовых дзяўчат, пледаў і пасцелі.

У Беластоку: 732 01 86, 712 11 53

• Сям'я просіць дапамогі ў выглядзе адзення, пасцелі і яды.

• Старэйшае сужонства шукае асобу, якая бясплатна дапаможа ў хатніх працах.

• Сям'я патрабуе помачы ў выглядзе яды і гігіенічных сродкаў.

• Сям'я будзе ўдзячна за любую помач.

• Тры сям'і з Відава, што каля Бельска-Падляшскага, з ахвотай аддадуць зімовыя курткі, мужчынскія і жаночыя штаны, світэры і іншае нязнішчанае адзенне, тэл. 730 40 00.

• Аддам дзіцячае адзенне ў добрым стане, тэл. 745 44 84.

Сабрала Паўліна Шафран-Асташэвіч

Абвесткі

Прыродазнаўча-лясны музей Белавежскага нацыянальнага парку ў Белавежы запрашае на новую экспазіцыю: лясное зборышча, траваедныя, драпежнікі, дзейнасць чалавека. У сезоне наведванне цэлы тыдзень ад 9 да 16³⁰ гадз. **(мох)**

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Nakład: 1 053 egz.
Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (0 10xx 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*

Zrealizowano przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury.
Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Сакратар рэд.: Аляксандр Максімюк.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран-Асташэвіч.

Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na IV kwartał 2004 r. upływa 5 września 2004 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.

2. Cena prenumeraty na IV kwartał 2004 r. wynosi 26,00 zł.

3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68124010531111000004430494.

4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,45 zł, a kwartalnie — 44,85 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa", Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta BPH PBK SA Oddział w Białymstoku 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.

„Даўціпы"
Андрэя Гаўрылюка

Футбольныя суддзі апавядаюць пра свае праблемы.

— Я, — кажа бразільскі суддзя, — вяртаюся з матча дадому ў касцы на галаве і з паліцэйскай аховай.

— А я, — кажа англічанін, — пасля матча вяртаюся дадому на паліцэйскім бронетранспарцёры.

— Я не маю такіх праблемаў, — кажа італьянец. — Калі пакідаю стадыён, балельшчыкі з пашанай прапускаюць мяне, а некаторыя нават цалуюць мяне па руках...

— Як табе гэта ўдаецца? — цікавяцца суразмоўцы.

— Перапранаюся за рымскага папу.

* * *

Актрыса прыходзіць да рэжысёра:

— Хачу зайграць у вашым фільме...

— А вы ўжо выступалі ў фільмах?

— Так: іграла ў „Зорных войнах" Лукаса, ва ўсіх фільмах Бергмана ды амаль ва ўсіх найслаўнейшых рэжысёраў...

— Гэта дзіўна, бо ніколі не бачыў вашага прозвішча.

— Бо яго трэба шукаць там, дзе напісана „і іншыя".

* * *

— Бармен, чаму вы сервіруеце піва п'яным?

— Бо цвярозыя выпіваюць толькі адзін куфель.

* * *

Малады энтузіяст коннай язды хоча наняць каня. Уласнік стайні патрабуе заплаты авансам.

— Не баіцеся, што магу вярнуцца без каня? — пытае першы.

— Зусім наадварот: баюся, што конь вернецца без вас.

* * *

Вярнуўшыся з далёкай экскурсіі Кавальскі расказвае сябру пра свае прыгоды:

— Затвор у стрэльбе мне запнуўся, а тыгр бяжыць проста на мяне: ледзь удалося мне залезці на дрэва! Прысеў на другой галіне...

— А тыгр?

— Тыгр далей за мною! Калі ён дасціг трэцяй галіны, я ўжо быў на пятай...

— А тыгр?

— Слухай — ты чый бок трымаеш?..

Музычная размова

Зміцер Вайцюшкевіч — вядомы як Тодар, раней сябра гуртоў „Палац", „Крыві", зараз лідэр „В-З Аркестры". Як саліст супрацоўнічае з многімі міжнароднымі камандамі. Зміцера сустрэў я на „Басовішчы" і шмат цікавага даведаўся пра яго ныя планы:

— „Басовішча" — мерапрыемства, якое зусім не падыходзіць да Тваёй творчасці...

— Я пабываю на многіх фестывалях у свеце, дык і „Басовішча" нельга абмінаць. Хаця па музычнаму жанру ён вельмі адрозніваецца ад тых фестываляў, на якіх я прывык пабываць. Скажу больш, дзесьці ўсярэдзіне рыхтуюся да такой музыкі. І гэта не таму, каб выступіць на гэтай сцэне... Я адчуваю такую моцную энергію ў гітарным гучанні. Адмыслова я вось тут знайшоўся каб паслухаць, а нават павучыцца. А тут, як мала дзе, усё зроблена па багатаму і што мне патрэбнае — тут многа маладых твараў.

— Зараз у Цябе самы высокі ўзровень у творчым жыцці. Што ў ім зараз цікавага адбываецца?

— Самае важнае польскім беларусам гэта тое, што рыхтую два праекты: адзін з гуртом „Чарамшына", другі праект на другім канцы Польшчы, у Познані, з квартэтам „Ёргі". У Беларусі спадзяюся да снежня запісаць і выдаць дыск на паэзію Рыгора Барадуліна. У лютым яму споўніцца семдзесят гадоў. Ну і вось ёсць планы на цяжкае гучанне.

— Цяжка ўявіць Цябе ў радыкальнай рок-выяве. Думаеш, пазітыўна ўспрымуць гэта Твае фанаты?

— Спадзяюся на гэта. Я хачу ў кожным стылі неяк сябе праявіць. Мне падабаецца магутная энергія, мне падабаецца ўлада „драйву" над публікай, і калі я пачынаў з такіх лёгкіх лірычных тэм, зараз магу сказаць што даспеў і да жорсткага рок-гучання. А матэрыял, які будзе выкарыстаны... не магу зараз многа казаць. Думаю, што скарыстаемся паэзіяй Зміцера Вішнёва.

— А калі можна спадзявацца завяршэння ўсіх Тваіх праектаў?

— З „Чарамшынай" плануем увосені ўвайсці ў студыю гуказапісу на Беластоцкім радыё. Ці ўдасца хутка завяршыць працу — цяжка сказаць. У мяне і ў іх многа канцэртных планаў. Але Вайцюшкевіч тое робіць, пра што кажа, значыць, яно будзе. Астатнія праекты зараз цяжка ў часавай сферы ўдакладніць.

— А як справа маецца з Тваім несамавітым уплывам на жаночую частку слухачоў?

— Смяюцца людзі, што на мае канцэрты прыходзяць пажылыя кабеты. Гэта абсалютная лухта. Прыходзяць людзі ўсіх пакаленняў. Гэта праўда, шмат жанчын — вельмі. Так мне хочацца сказаць, што ў Беларусі акрамя мяне і прэзідэнта Лукашэнкі (смех)... ніхто не ўмее іх задаволіць. Але гэта жарт.

Гутарыў Татка Стэп

Музычныя навіны

БМА-груп вырашыла правесці забаронены ў траўні канцэрт у падтрымку беларускага ліцэя. На жаль, не абышлося без сварак і непрыемнасцей. З канцэртам адмовіўся выступіць Аляксандр Памідораў. Як кажа, пра канцэрт даведаўся з плакатаў, да таго высокая цана квіткоў, паводле яго, мае прыслужыцца грошавым непарадкам. „Гурты выступаюць дарма, таму што канцэрт дабрачынны, а квіткі дарагія, бо трэба аплаціць тэхнічнае абсталяванне, залу і ахову канцэрта", — гавораць арганізатары. Як зараз вядома, на дзве гадзіны да канцэрта дырэктар клуба, у якім меў ён адбыцца, вырашыў мерапрыемства не праводзіць. Прычына палітычная — боязь ад уладаў за тое, што канцэрт арганізаваны ў падтрымку забароненага ўладамі ліцэя.

— Канцэрт усё роўна адбудзецца. Будзем шукаць новае месца для правядзення канцэрта, — кажа арганізатар Ф. Вячорка.

Татка Стэп

12.09 – 18.09

Баран (21.03. — 19.04.) З 12.09. (аж па 20.09.) секстыль Марса з Сатурнам паможа табе справіцца з нейкай цяжкай справай. Знакаміта дагаворышся з шэфам, а таксама з непрыхільнымі дагэтуль чыноўнікамі. Каля 12.09. маеш шанц запанаваць над сваім жыццём. Спрыяльныя супадзенні абставін.

Бык (20.04. — 20.05.) З 16.09. адпусці новыя мерапрыемствы, бо можаш кепска ацаніць сітуацыю, заблытаць справы. На працы не адкладвай нічога на пасля. Сканцэнтруйся!

Блізняты (21.05. — 21.06.) Да 19.09. зможаш дагаварыцца з усімі. У пары больш важным акажацца еднасць душ ад іншага. 11 — 14.09. можаш зрабіць памылкі ў рашэннях, што можа паблытаць справы і нават перашкодзіць у кар'еры. Можаш выдаць зашмат, але зможаш здысцыплінавацца ў выдатках.

Рак (22.06. — 22.07.) З 15.09. будзеш мець падтрымку асяроддзя. Будзеш моцны псіхічна і трывалы. Няхай табе не здаецца, што нікому на табе не залежыць. Не ператамляйся і не зрывай начэй.

Леў (23.07. — 22.08.) Да 14.09. могуць быць акалічнасці, якія прымусяць цябе да змен. Венера настроіць цябе вельмі рамантычна. Твой сексапіль прыцягне да цябе шмат прыхільнікаў. Вяртанне ў школу для шматлікіх Ільвоў будзе нялёгкае, цяжка будзе ім сканцэнтравацца і цудам пазбегнуць благіх ацэнак.

Дзева (23.08. — 22.09.) Будзеш вельмі спрытная, дбайная. Твае ідэі будуць мець поспех у асяроддзі. 14.09. можаш справіцца з важнымі выклікамі.

Шалі (23.09. — 23.10.) З 16.09. не распачынай ніякіх вялікіх мерапрыемстваў, не дакляруйся; апазіцыя Венеры да Нептуна можа разбудзіць ілюзіі, мроі, якія не маюць шанцаў на здзяйсненне. Не давярай абятніцам. У сям'і добрая атмасфера.

Скарпіён (24.10. — 21.11.) Да 14.09. пазбягай людзей, якія схочуць над табою запанаваць. Могуць зацікавіць цябе хобі партнёра, дзякуючы чаму пашырыш уласныя гарызонты. Не старайся паказваць сябе бесдамылковым, якраз цяпер можаш нарабіць сабе ворагаў, нават выклікаць агрэсіўнасць да твае асобы.

Стралец (22.11. — 21.12.) Знакаміты час якраз цяпер выбрацца ў адпачынак. Калі хочаш памяняць месца жыхарства, зрабі гэта 11 — 15.09. Калі шукаеш працу, звярні ўвагу можа на не найбольш атракцыйную, але стабільную.

Казярог (22.12. — 20.01.) З 15.09. (аж да 20.09.) будзеш здольны да дзеянняў, патрабуючых немалога высілку. Паслядоўнасць гарантуе поспех.

Вадалей (21.01. — 19.02.) 11 — 15.09., калі выбіраешся ў падарожжа на машыне, будзь асабліва асцярожным, не шалей на дарозе. Трымай свае нервы. Адсвяжы памяшканне, дзе найбольш прабываеш. 11 — 15.09. можаш здабыць тое, што страціў.

Рыбы (20.02. — 20.03.) Каля 14.09. маеш шанц наладзіць проста знаёмствы, якія могуць прынесці плён у будучыні. Каля 16.09. лёгка цябе абмануць, выкарыстаць. Звярні асаблівую ўвагу на таго, што над табою завельмі скача.

Агата Арлянская

Адгаданка

Шыфраграма

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10
11	12	13	14	15	16	17	18	19	20
21	22	23	24	25	26	27	28	29	30
31	32	33	34	35	36	37	38	39	40
41	42	43	44	45	46	47	48	49	50
51	52	53	54	55	56	57	58	59	

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — афарызм Аніты Даніэль.

1. мужчынскі голас = 51 _ 50 _ 52 _;
2. рыбалоўная снасць з лёскай і кручком = 15 _ 2 _ 31 _ 16 _;
3. расійскі парламент = 41 _ 30 _ 29 _ 9 _;
4. працэс паглынання кісларода і выдзялення вуглякіслага газу жывымі арганізмамі = 46 _ 48 _ 49 _ 40 _ 26 _ 23 _ 24 _;
5. жыхар Берліна = 38 _ 39 _ 28 _ 27 _ 35 _;
6. апрацаванае пад сяўбу поле або бачная газета = 25 _ 56 _ 55 _ 54 _;
7. адзінка адміністрацыйнага падзелу краіны напр. з цэнтрам у Гайнаўцы або Саколцы = 42 _ 43 _ 44 _ 45 _ 11 _;
8. адметная рыса (анаграма „мера" + „тып") = 18 _ 19 _ 20 _ 21 _ 17 _ 53 _ 7 _;
9. гмінная мясцовасць між Саколкай, Новым Дваром і Дубровай = 10 _ 36 _ 1 _ 32 _ 33 _;
10. сеянне і яго пара = 34 _ 22 _ 37 _ 13 _ 12 _;
11. годнае крэсла = 6 _ 3 _ 5 _ 4 _;
12. мангольскі ўладар = 59 _ 58 _ 57 _;
13. службовы разрад служачых = 8 _ 14 _ 47 _; **(ш)**

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку з 31 нумара

Масквіч, Зізаній, дурнота, Галівуд, Украіна, міністр. Рашэнне: **Кісларод.** Кніжныя ўзнагароды высылаем **Барыславу Рудкоўскаму** з Бельска-Падляшскага і **Мікалаю Сазановічу** з Навін-Вялікіх.

ISSN 0546-1960